

ДАЙВЕРЫ РОСТУ РЭГІЁНАЎ

МС

ЗБЕРАГЧЫ ВЯСКОВЫ КЛУБ



МС

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

7 ЛЮТАГА 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 25 (29139)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVпраграма

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:**

*«Беларусь будзе рухацца ў тым напрамку, які будзе адпавядаць яе нацыянальным інтарэсам. Наша прынцыповая пазіцыя ў тым, што мы не можам і не павінны сябраваць з кімсьці ў шкоду каму-небудзь ці супраць каго-небудзь. У Беларусі гістарычна склаліся добрыя адносіны з вялікім усходнім суседам — Расіяй. Мы ні ў якім разе не хочам разрываць гэтыя адносіны. Наадварот, мы гатовыя, маем намер і будзем надалей умацоўваць ўсебаковае супрацоўніцтва з Расіяй ва ўсіх сферах і галінах. Але гэта не значыць, што мы павінны зацыклівацца толькі на адным кірунку».*

## КОРАТКА

• Рэспубліканскі злёт маладых работнікаў АПК збярэ ў Горках каля 300 удзельнікаў.

• **У беларускіх тэхнапарках у 2019 годзе з'явілася 600 новых працоўных месцаў.**

• У Астраўцы адкрылі шматфункцыянальны спарткомплекс.



• **«БелДжы» ў 2020 годзе плануе вырабіць каля 28 тысяч аўтамабіляў.**

• Беларусь і Украіна будуць выконваць аўтаперавозкі на бездазвольнай аснове.

• **У краіне аб'яўлены конкурс творчых работ да 25-годдзя дзяржаўных сімвалаў.**

• Сёння з-за моцнага ветру ў Беларусі абвешчаны аранжавы ўзровень небяспекі.

ISSN 1990 - 763X

# Лыжня-2020



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Нягледзячы на незімовыя кліматычныя ўмовы, лыжная траса ў сталічным раёне Вяснянка дзейнічае. Праўда, з паўтаракіламетровай снежнай дыстанцыі засталося толькі 100—150 метраў. Тым не менш лыжня не пустуе, бо ахвочыя пабегаць на лыжах не чакаюць марознага надвор'я.

Разумныя грошы

# Рубель — галоўны

## Як праходзіць дэдаларызацыя

**Як вядома, урад зацвердзіў стратэгію павышэння даверу да нацыянальнай валюты да 2035 года. Гэты дакумент знаходзіцца ў адкрытым доступе на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале. Сярод мер па дэдаларызацыі — адвязаць ад замежнай валюты стаўкі падаткаў, арэнднай платы, а таксама цэн і тарыфаў. Разбяромся больш удумліва.**

### ГЭТЫ ПРАЦЭС ПРАЦЯГЛЫ

Кіраўніцтва і Нацыянальны банк, «разумеючы першараднасць пытання аб аднаўленні даверу да нацыянальнай валюты, будуць рэалізоўваць узгодненую палітыку, якая дазволіць забяспечыць галоўную ролю беларускага рубля ва ўнутранай эканоміцы», — гаворыцца ў стратэгіі. А падмуркам далейшага аднаўлення даверу да беларускага рубля застанецца рэалізацыя паслядоўнай палітыкі па забеспячэнні ў краіне цэнавай стабільнасці і макраэканамічнай збалансаванасці. Але тут жа ў дакуменце гаворыцца, што «працэс поўнага аднаўлення даверу да нацыянальнай валюты можа быць доўгім».

Пра тое, што беларускай эканоміцы патрэбна дэдаларызацыя, фінансісты задумаліся яшчэ ў 2009 годзе. А неўзабаве былі зроблены першыя крокі да пастаўленай мэты. Нацбанк перастаў выдаваць новыя ліцэнзіі на разлікі ў наяўнай замежнай валюце, стаў праводзіць палітыку зніжэння ставак па фінансавых інструментах у замежнай валюце, а потым забараніў выдаваць насельніцтву крэдыты ў замежнай валюце.

Услед за забаронай выдачы людзям валютных крэдытаў урад прыняў яшчэ адну меру: пастановай Саўміна суму здзелак з нерухомасцю, ад якой вызначалася стаўка на рыэлтарскія паслугі, адвязалі ад еўра. З 1 жніўня 2009 года стаўка вызначаецца выключна беларускімі рублямі, а яе памер — базавымі велічынямі. Паслугі рыэлтараў значна патаннелі.

СТАР. 4

Спытайце ў «Звязды»

# ДЫ «ЧХАЦЬ» НА ПАСЫЛКІ!?

— У мяне двое маленькіх дзяцей. Працую дома. Я рамеснік па рамонце адзення. Без дробязяў з кітайскага сайта — ніяк, — з апраўдальнай ноткай у голасе расказвае сваю гісторыю **Ірына ЧЫРЫЧ** з Петрыкаўскага раёна. — Расходнікі: лапкі для трыкатажу і экаскуры, шпулькі, лякалы — і ў вялікім горадзе па даступнай цане не адшукаеш, што ўжо казаць пра нашу вёску. Заказала ўсё гэта на пачатку студзеня. Праз месяц паштальёнка прынесла паведамленне, што пасылка прыйшла. А я баюся ісці забіраць. Можа, нават аштрафуюць, што з Кітая нешта заказала? Недзе быццам казалі, што гэта цяпер забаронена — з-за каранавіруса.

За адзін дзень дзве маладыя жанчыны з розных раёнаў Гомельшчыны звярнуліся ў карэспандэнцкі пункт «Звязды». Мабыць, што рабіць — баімся забіраць свае тавары, якія заказалі ў кітайскай інтэрнэт-краме.

СТАР. 4



З першых вуснаў

# «Ні адзін жыхар Беларусі і ні адно прадпрыемства не павінны адчуць на сабе наступствы ад featured рознага роду манеўраў нашых партнёраў»

## Напярэдадні сустрэчы з Уладзімірам Пуціным, якую Аляксандр Лукашэнка ахарактарызаваў, як момант ісціны, прайшла нарада па паліўна-энергетычных пытаннях

**Больш за два тыдні таму на сустрэчы з кіраўніцтвам урада і нафтаперапрацоўчай галіны Прэзідэнт Беларусі прадставіў новую схему паставак «чорнага золата» ў краіну — 40-30-30. 40 працэнтаў будзем купляць у Расійскай Федэрацыі, працэнтаў 30 — завозіць з Балтыкі, яшчэ 30 — праз Украіну. Кола «нафтавых» партнёраў пашыраецца паступова. Беларускія НПЗ ужо апрабавалі нарвежскую нафту, засталіся сувязі з пастаўшчыкамі з Венесуэлы, абмяркоўваюць пытанне з Казахстанам, свае паслугі прапанавалі нават ЗША. Варыянты ёсць, але якім чынам іх магчыма рэалізаваць, — пытанне, на якое ўчора на нарадзе ў Палацы Незалежнасці звярнулі асаблівую ўвагу.**



Фота БелТА.

Былі на парадку сустрэчы і іншыя акцэнты — меры па выкананні прагнозных паказчыкаў і пераадоленні негатыўных тэндэнцый у эканоміцы, звязаных з апошнімі падзеямі ў свеце і ва ўзаемаадносінах з Расіяй.

«Гэта не толькі вузкія пытанні. Яны ва ўсіх на слыху — пастаўкі нафты, газу, харчовыя войны, якія, на жаль, сталі звыклымі ў апошнія гады. ***Гандлёвыя канфлікты паміж дзяржавамі-лідарамі, пратэкцыянізм і нават новы азіяцкі вірус — усё гэта ўплывае на сусветную эканоміку, а значыць, мы не можам ігнараваць тое, што адбываецца***», — сказаў кіраўнік краіны.

Таму перш за ўсё ўраду неабходна загадзя мець планы рэагавання на любы магчымы выклік, «а не закрываць амбразуру целамі, калі ўжо пачаўся бой». ***Галоўнае, як заўсёды адзначае Прэзідэнт, — захаваць мір і спакой у краіне, устойлівасць эканомікі і ўпэўненасць грамадзян у заўтрашнім дні.***

Жыццё прымушае порах заўсёды трымаць сухім. Таму і запытаў кіраўнік краіны аб тым, што ёсць у арсенале ўрада для рэагавання на праблемныя пытанні: як будзе забяспечаны рост валавога ўнутранага прадукту, выкананне параметраў бюджэту, цанавая стабільнасць і паступальны рост даходаў усіх слаёў насельніцтва.

***«Ні ад адной праграмы мы адмовіцца не можам. І не толькі таму, што гэты год — год экзаменаў»***, — акцэнтаваў увагу беларускі лідар.

Па яго словах, у чарговы раз паўсталі рознагалоссі па энергетычных пытаннях з бліжэйшым партнёрам, і гэта адбываецца рэгулярна ўжо на працягу 13 гадоў, нягледзячы на ўзаемныя абавязацельствы.

«Хоць пры іх падпісанні нам былі дадзены цвёрдыя гарантыі. Да прыкладу, у гэтым годзе Расія абавязалася на міжурадавым узроўні паставіць у Беларусь 24 мільёны тон нафты. Па два мільёны кожны месяц. У студзені было пастаўлена 500 тысяч — адна чвэрць», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка і даў задачу прэм'ер-міністру далажыць, што зроблена, каб Расія выканала задачу.

Пацікавіўся Прэзідэнт механізмамі кампенсацыі страт, якія наша краіна непазбежна панясе ў гэты перыяд, і тым, як выконваецца даручэнне аб пошуку альтэрнатыўных пастаўшчыкоў энергарэсурсаў, надзейных каналах іх пастаўкі. ***«Патрабаванні вядомыя — ні адзін жыхар Беларусі, ні адно прадпрыемства не павінны адчуць на сабе наступствы ад рознага роду манеўраў нашых партнёраў»***, — канстатаваў ён.

Аляксандр Лукашэнка асобна падкрэсліў, што ***усе нафтаперапрацоўчыя заводы краіны павінны працаваць і забяспечваць не толькі ўнутраны рынак (як гэта адбываецца цяпер), але і выконваць кантракты на знешнім.***

Як паведаміў у сваім дакладзе прэм'ер-міністр Сяргей Румас, з 2019 года ў Расіі пачалася рэалізацыя другога этапу падатковага манеўру, які прадугледжвае паэтапны пераход вывазных мытных пошлін на нафту ва ўнутраную расійскую крыніцу, падатак на здабычу нафты. Для Беларусі ў мінулым годзе агульныя страты ад гэтага склалі каля 330 мільёнаў долараў — 130 мільёнаў страты бюджэту і 200 мільёнаў страты НПЗ.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# «Мы ачышчалі ваду, уцяплялі дамы, будавалі самыя сучасныя дарогі»

## Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з прэзідэнтам Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця Сумам Чакрабарці падвёў вынікі ўзаемнага супрацоўніцтва

**Сума Чакрабарці не плануе перавыбірацца на трэці тэрмін, у ліпені яго паўнамоцтвы завяршаюцца. Таму сустрэча ў Палацы Незалежнасці пачалася са слоў шкадавання ад кіраўніка дзяржавы. Ад імя беларускага народа Аляксандр Лукашэнка падзякаваў за ўсё, што было зроблена для Беларусі падчас кіраўніцтва Банкам Сумам Чакрабарці.**

«***За гады супрацоўніцтва Банк інвеставаў у Беларусь каля трох мільярдаў долараў, толькі летась каля чатырох сот мільёнаў долараў.*** Мы ачышчалі ваду, уцяплялі дамы за гэтыя грошы, будавалі самыя сучасныя дарогі ў Беларусі. Гэта звязана з вашым імем, я тут нічога не перабольшваю», — Прэзідэнт нават прапанаваў адну з дарог назваць дарогай Чакрабарці — таму што самыя лепшыя трасы пабудаваныя з дапамогай падтрымкі Банка.

Як падкрэсліў кіраўнік краіны, дарогі будуюцца не толькі і не столькі для беларусаў, колькі для Расіі, іншых усходніх дзяржаў і Еўрапейскага саюза, калі ўлічыць, што толькі летась па тэрыторыі нашай краіны перамешчана 110 мільёнаў тон грузаў. ***Больш за 70 % з іх — грузы не для Беларусі.***

Таму Аляксандр Лукашэнка з вялікай надзеяй глядзіць на далейшае супрацоўніцтва з Банкам у плане працягу будаўніцтва дарог. Разлічвае Беларусь і на дапамогу ва ўсталяванні такіх жа сяброўскіх адносін з Вялікабрытаніяй, як і з Банкам развіцця. І вядома, Прэзідэнт запрасіў Суму Чакрабарці наведваць Беларусь у любы час, нават без віз і папярэджання.

У сваю чаргу кіраўнік ЕБРР падкрэсліў, што адносіны паміж Беларуссю і Банкам узмацняліся менавіта пад кіраўніцтвам Аляксандра Лукашэнкі.

Так, з першай сустрэчы ў 2015 годзе Банк укладаў шмат у развіццё інфраструктуры нашай краіны. Летась Беларусь заняла дзявятае месца сярод краін па гадавым аб'ёме аперацый — інвестыцыі Банка дасягнулі рэкордных 390 мільёнаў еўра.

«Мы разлічваем і на далейшае супрацоўніцтва, на тое, што Беларусь у наступныя некалькі гадоў увойдзе ў пяцёрку краін, з якімі Банк супрацоўнічае», — абазначыў Сума Чакрабарці.

Ён не толькі падкрэсліў, што ***імідж Беларусі змяняецца да лепшага і становіцца больш пазітыўным у вачах акцыянераў***, у тым ліку дзякуючы працы Банка, але і высока ацаніў нашы намаганні ў наладжванні адносін з Еўрапейскім саюзам і ЗША.

Сума Чакрабарці паведаміў журналістам, што за апошні год завершаны буйны праект на 126 мільёнаў еўра па рэканструкцыі і будаўніцтве дванаццаці мастоў, ажыццяўляецца праект па экспарце грузавікоў у Індыю.

«Беларуская эканоміка патрабуе далейшай мадэрнізацыі. ***І мы будзем працаваць, каб дапамагчы Беларусі прыцягнуць новых інвестараў і развівацца і надалей.*** Колькасць інвестыцый будзе залежыць ад умоў, у якіх мы працуем. Чым больш канкрэтных рэформ у палітыцы, стратэгіі, тым больш інвеставання ў пэўныя галіны эканомікі», — такія перспектывы бачыць прэзідэнт Банка.

У прыклад ён прывёў магчымасць набыцця долі ў Белінвестбанку, што будзе добрым знакам для іншых інвестараў. Гэта пытанне таксама абмеркавалі з кіраўніком дзяржавы.

Сума Чакрабарці праанансаваў падчас інвестыцыйнага форуму сустрэчы ў маі — асобная сесія будзе прысвечана пытанням інвеставання ў беларускія праекты.

«Праца ў гэтым рэгіёне з'яўляецца прыярытэтам нашай стратэгіі, і рэгіён цалкам з'яўляецца прыярытэтным кірункам для працы нашага Банка. Мы бы хацелі адкрыць для сябе новыя праекты — напрыклад, у галіне медыцыны. Акрамя таго, мы падтрымліваем зацікаўленасць Прэзідэнта ў развіцці «зялёнай эканомікі». Толькі за апошні год 46 % інвестыцый былі менавіта ў гэтай галіне. Асаблівы інтарэс прадстаўляе электратранспарт», — паведаміў кіраўнік ЕБРР.

Ён прадставіў і новага кіраўніка прадстаўніцтва Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця ў Беларусі. Гэту пасаду заняла Марына Пятроў.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# Размова на вышэйшым узроўні

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыбыў з рабочым візітам у горад Сочы Расійскай Федэрацыі, перадае БелТА.**

Сёння, 7 лютага, у Сочы адбудзецца сустрэча з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. У прэсслужбе беларускага лідара расказалі, што кіраўнікі дзяржаў абмяркуюць шырокі комплекс пытанняў, якія стаяць на парадку дня беларуска-расійскага супрацоўніцтва.

Аб плануемай сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі Аляксандр Лукашэнка расказаў 4 лютага падчас размовы з журналістамі на папяровай фабрыцы ў Добрушы Гомельскай вобласці. Ён падкрэсліў, што Беларусь хоча самых цёплых, добрых і сяброўскіх адносін з братэрскім народам Расіі, аднак звярнуў увагу на шэраг праблемных пытанняў, якія застаюцца ў міждзяржаўным супрацоўніцтве. Яны, у прыватнасці, датычацца пытанняў фарміравання цэн і паставак у Беларусь расійскіх энергарэсурсаў — газу і нафты.

У цэлым кіраўнік дзяржавы яшчэ раз заклікаў да канструктыўнага супрацоўніцтва.

# Авальная зала знутры

**Учора ў 14-ты раз сусветная супольнасць адзначыла свята, мэта якога — нагадаць пра важнасць дэмакратычных выбараў, павышэнне актыўнасці выбаршчыкаў, а таксама нагадаць палітыкам аб іх адказнасці за ўмацаванне дэмакратыі, — Сусветны дзень выбараў.**

Паказальна, што менавіта да гэтай даты быў прымеркаваны візіт мінскіх школьнікаў у Палату прадстаўнікоў і іх сустрэча са **старшынёй Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэферэндумаў Лідзіяй ЯРМОШЫНАЙ.**

— Мы запрасілі самых актыўных маладых людзей — лідараў пярвічных школьных арганізацый БРСМ, удзельнікаў клуба «Малады выбаршчык», актывістаў праекта «Крок» — тых дзяўчат і хлопцаў, якім неабыякава будучыня нашай краіны, — расказаў журналістам **член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Сяргей КЛІШЭВІЧ.** — Думаю, ім цікава паглядзець знутры, як працуе вышэйшы заканадаўчы орган краіны, пагутарыць з кіраўніком Цэнтрвыбаркама. Думаю, нехта з іх, магчыма, стане і дэпутатам. Калі вучыўся ў школе, я прыходзіў у парламент на экскурсію, а сёння прадстаўляю ў ім Кастрычніцкую выбарчую акругу № 97 горада Мінска.

Па меркаванні дэпутата, беларускай выбарчай сістэме бракуе сучасных тэхналогій.

— Магчыма, галасаванне па інтэрнэце дачаснае, але іншыя тэхналогіі маюць права на жыццё, — лічыць ён. — Цяпер актывісты БРСМ Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі прапанавалі распрацаваць мабільную праграму «Мой дэпутат», праз якую можна будзе атрымаць даныя аб гадзінах прыёму дэпутата, кантакты яго і яго памочніка, мець зносіны з ім у рэжыме анлайн праз сацыяльныя сеткі. Пазнавальнасць дэпутата — актуальная праблема, і моладзі, якая «сядзіць у гаджэтах», трэба прапанаваць адпаведную форму, таму такая ініцыятыва, мяркую, павінна атрымаць падтрымку.

Лідзія Ярмошына паведаміла маладым людзям, што падобныя сустрэчы будуць традыцыйныя, падобным чынам робяць і цэнтрвыбаркамы іншых краін. Яна расказала пра структуру беларускага парламента, выбарчую сістэму і выбары ў Беларусі, кампетэнцыю і статус Цэнтральнай выбарчай камісіі, рэферэндумы, якія праходзілі ў нашай краіне.

— Наша мажарытарная сістэма чым добрая? Па-першае, яна ўлічвае меркаванне большасці выбаршчыкаў, па-другое, дазваляе прагаласаваць за канкрэтную персону. Але яе слабым бокам з'яўляецца тое, што не ўлічваецца меркаванне меншасці, — патлумачыла старшыня ЦВК будучым выбаршчыкам. — У той час як прапарцыянальная сістэма дазваляе пачуць галасы меншасці выбаршчыкаў і садзейнічае развіццю палітычных партый, якія фарміруюць палітычны фон і палітычную эліту. У нашай краіне адбываецца дыскусія пра тое, што, магчыма, надышоў час перайсці да змешанай сістэмы. Але канкрэтная прапанова пра ўнясенне змяненняў у Канстытуцыю, у нашы заканадаўчыя акты пакуль не выпрацавана і ў парламент не ўносілася. Прэзідэнт не так даўно сказаў, што мажарытарная сістэма ў нашай краіне яшчэ не выпрацавала свой рэсурс і можа паспяхова выкарыстоўвацца.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Сугучча

# КНІГІ БЕЗ МЕЖАЎ

**Шосты раз у межах Мінскай міжнародный кніжнай выстаўкі-кірмашу прайшоў традыцыйны Міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час». Сёлета яго ўдзельнікамі сталі паэты, празаікі, перакладчыкі, журналісты, літаратуразнаўцы, педагогі, грамадскія дзеячы і нават дыпламаты — прадстаўнікі 20 краін свету абмеркавалі магчымасці і перспектывы літаратуры, як складовай часткі культурнага дыялогу.**





«Сімпозіум літаратараў стаў пляцоўкай, якая зацвярджае міралюбнасць і добрасуседства, — падкрэсліў 6 лютага на адкрыцці літаратурнага форуму **міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ.** — Беларусы ведаюць цану міру, і многія пакаленні людзей, якія жылі ў драматычныя перыяды гісторыі, нагадваюць нам пра тое, што гэта самая вялікая каштоўнасць чалавечага жыцця».

«Свет імкліва змяняецца, і, на жаль, не заўжды гэтыя перамены ў лепшы бок, — звярнуўся да аўтараў з розных краін **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ.** — Што могуць зрабіць, адгукаючыся на актуальныя праблемы і запыты сучаснага грамадства, пісьменнікі — «інжынеры чалавечых душ», як гаварыў Максім Горкі, «вочы і вушы народа», як казаў Янка Купала? А пісьменнікі могуць зрабіць многае. І нам трэба дбаць аб тым, каб вярнуць у грамадстве павагу да слова, любоў да кнігі, каб павысіць культуру падрастаючага пакалення. Я перакананы, што кнігі мусяць стаць у тым ліку інструментам палітыкаў, каб на змену дыктату сілы прыйшоў дыктат слова». **Іранскі пісьменнік, выкладчык, дырэктар Фонду паэзіі і мастацкай літаратуры Мехдзі ГЕЗЕЛІ** падтрымаў беларускага калегу: «Нам, людзям літаратуры, трэба садзейнічаць нараджэнню новага мірнага часу, у якім людзі будуць жыць у гармоніі ды спакоі, у якім адродзяцца такія каштоўнасці, як свабода, роўнасць, любоў і духоўнасць».

Удзельнікі сімпозіума расказалі аб тым, як кожны з іх уяўляе і рэалізуе на практыцы культурны дыялог праз літаратуру. **Расійскі публіцыст, намеснік рэдактара часопіса «Наш современник» Аляксандр КАЗІНЦАЎ** адзначыў: «Цяпер літаратура перажывае не лепшыя часы, і тое, што ў Беларусі яна мае падтрымку на дзяржаўным узроўні — вельмі каштоўна». Дарэчы, у кожным «беларускім» нумары часопіса друкуюцца сучасныя беларускія аўтары, а сучасныя расійскія літаратары выдаюць свае кнігі ў Беларусі, як, напрыклад, маладая пісьменніца Алена Тулушава, і гэты абмен узбагачае літаратурную палітру абедзвюх краін.

Былы пасол Славакіі ў Беларусі, а таксама **паэт і перакладчык Марыян СЕРВАТКА** ўзгадаў, як некалі з дапамогай беларускіх сяброў і аднадумцаў ініцыяваў праект «Дыялог культур», у межах якога ў Славакіі прайшоў шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных Янку Купалу. «Я ўпэўнены, што такі дыялог мусіць працягвацца — і не толькі праз літаратуру, а ва ўсіх галінах мастацтва, каб супрацьстаяць глабалізацыі, уніфікацыі нацыянальных культур. Трэба будаваць, наводзіць наноў, у рэшце рэшт, рамантаваць разбураныя культурныя масты паміж краінамі».

Узвесці такі мост можна нават самому, што яскрава прадэманстравала Ахела Эспіноса Руіс *(на фота)*. Дзяўчына, апантаная беларускай моваю і літаратурай, выдала на дзвюх мовах — беларускай і іспанскай — зборнік 30 вершаў Максіма Багдановіча, які зацікавіў не толькі беларускую дыяспару і іспанскую інтэлігенцыю — яго з захапленнем чытае нават 88-гадовая бабуля паэткі!

А, напрыклад, для народнага паэта Чувашыі Валерыя Тургая вынікам асабістага знаёмства з Беларуссю стала невялікая анталогія беларускай паэзіі на чувашскай мове і ўдзел у маштабным творчым праекце — перакладзе санетаў Янкі Купалы на мовы свету. (Дарэчы, у маі гэтага года ў Чэбаксарах, сталіцы Чувашскай Рэспублікі, плануецца адкрыццё мемарыяльнай дошкі беларускага песняра.)

Нам варта перастаць думаць стэрэатыпамі, перакананая частая госця Беларусі, **нямецкая пісьменніца і кіраўнік дабрачыннага фонду падтрымкі пацярпелым ад аварыі на ЧАЭС Хайке ЗАБЕЛЬ:** «Гэта было б так проста, калі б можна было рассартаваць людзей па скрынках паводле нацыянальнасці: вось «тыповы беларус», вось «тыповы немец»... Але межы паміж намі сціраюцца, і замест таго, каб гаварыць адно пра аднаго, давайце больш гаварыць адно з адным. Я напісала тры кнігі пра Беларусь, як многія ўдзельнікі сімпозіума, — але, быць можа, наперадзе яшчэ адна, якую напішам усе мы разам — сукупнасць поглядаў на Беларусь пісьменнікаў з розных краін?»

Узаемныя пераклады і выданне анталогій, лакальныя і маштабныя сумесныя творчыя праекты, арганізацыя дзён нацыянальных культур, захаванне памяці выбітных дзеячаў літаратуры — гаворку на гэтыя тэмы ўдзельнікі міжнароднага сімпозіуму літаратараў працягнуць і сёння на семінарах, творчых сустрэчах са школьнікамі і студэнтамі ВНУ, на літаратурным пленэры ў Барысаве. Але найважнейшую рэзалюцыю форуму прынялі яшчэ ўчора: пісаць актуальна, шчыра і цікава, глыбока і ўдумліва, каб не было ніякіх перашкод і межаў паміж аўтарамі і чытачамі з розных краін.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

Блізкая ўлада

## АБЛВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі пройдуць у суботу 8 лютага ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме.**

На званкі жыхароў краіны з 9.00 да 12.00 будуць адказваць:

• першы намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Валерый Васілевіч РЭБКАВЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;
• намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;
• намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;
• кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;
• кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;
• кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
• кіраўнік спраў МІНСКАГА гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАЦЕЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

## Заходні вецер зменіцца паўночным

Снег, мокры снег і галалёдзіца на дарогах...

**Гэты халодны сезон быў шчодры на сінаптычныя сюрпрызы. Зіма да нас прыходзіла, але не наступала. Няўжо ў гэтыя выхадныя нашу тэрыторыю ўсё ж такі прыцярушыць снегам? Акрамя таго, будзе досыць марозна і ветрана, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння месцамі па ўсходзе краіны пройдзе невялікі снег. Адчуванне холаду ўзмоцніць парывісты вецер. У суботу ўначы па паўночным захадзе, а ўдзень на большай частцы краіны адаб'ецца ўплыў атмасфернага фронту, які змяшчаецца з тэрыторыі Фінляндыі. Таму ўначы пераважна па паўночным захадзе, а раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдзе снег і мокры снег. У асобных раёнах чакаюцца слабы туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Прагназуецца, што заходні вецер зменіцца паўночным, паўночны пяройдзе на заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да 11 градусаў марозу, месцамі — да мінус 13 градусаў. Удзень будзе ад мінус 5 градусаў па паўднёвым усходзе да 2 цяпла на захадзе краіны.

Праўда, пахаладанне ў нас будзе нядоўгім. Ужо ў нядзелю пацяплее. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 7 градусаў да нуля, а ўдзень — ад нуля да плюс 6 градусаў. Ноччу і раніцай у асобных раёнах пройдзе невялікі кароткачасовы мокры снег, удзень будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай месцамі чакаюцца слабы туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер прагназуецца заходні, паўднёва-заходні ўмераны, удзень месцамі парывісты.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Рэгіёны

## А прасы на спірце вы бачылі?

**Сёння ў Чавускім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі адкрываецца выстаўка «Музей праса». Гэта сумесны праект Мінгардаведкі, Карткі Госця і музея ў Чавусах, а таксама першы выезд калекцыі праса з Траецкага прадмесця Мінска ў рэгіён. Выстаўка будзе працаваць на працягу месяца.**



«У экспазіцыі прадстаўлены больш за 180 старадаўніх і эксклюзіўных прасаў, — паведаміла «Звяздзе» **дырэктар Чавускага раённага гісторыка-краязнаўчага музея Іна КАЗАКОВА.** — Наведванне выстаўкі стане цудоўнай магчымасцю пашырыць свой кругагляд і будзе вельмі пазнавальным для гасцей усіх узростаў. Ёсць такія дзіўныя экспанаты, якіх мы самі ніколі не бачылі».

Усяго ў сталічным Музеі праса дэманструецца больш за 700 экспанатаў з калекцый вядомых беларускіх калекцыянераў: цэльныя жалязякі, якія награваюцца на адкрытым агні, сярэднявечныя прасы на вугалі, працы з устáйкай — «душой», газавыя, на спірце, паравыя і электрычныя.

Ад супрацоўнікаў музея ў Чавусах госці даведаюцца не толькі пра асаблівасці канструкцыі гэтага прадмета быту, але і пра нюансы прасавання ў розныя перыяды гісторыі чалавецтва.

«Карта Госця» — гэта пластыкавая смарт-картка, якая дае права аднаразовага наведвання па ўсёй Беларусі (бясплатна або са зніжкай ад 10 да 50 %) музеяў, экскурсій, мастацкіх галерэй, заапаркаў, акваапаркаў і назіральнай пляцоўкі Нацыянальнай бібліятэкі.

Уласная экспазіцыя Чавускага гісторыка-краязнаўчага музея размешчана ў дзевяці залах. Усяго ў фондах раённай установы культуры — больш за адзінаццаць тысяч прадметаў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Амерыканскі сенат прагаласаваў супраць імпічменту Трампа

Амерыканскія сенатары прызналі невінаватым прэзідэнта ЗША Дональда Трампа па ўсіх пунктах абвінавачвання ў рамках слуханняў па імпічменту. Сенатары большасцю галасоў адхілілі абодва пункты абвінавачвання: злоўжыванне ўладай і перашкоды ў расследаванні, якое праводзіў Кангрэс. Такім чынам працэс імпічменту ў кангрэсе завяршыўся. Трамп застаецца на пасадзе прэзідэнта. Ён стаў трэцім прэзідэнтам у гісторыі ЗША, у дачыненні да якога ініцыявалі працэдуру імпічменту. Першым быў Эндру Джонсан у 1868 годзе, другім — Біл Клінтан у 1998-м. Усіх прэзідэнтаў апраўдаў сенат. Таксама працэдуру імпічменту Палата прадстаўнікоў ЗША спрабавала пачаць у 1973 годзе ў дачыненні да Рычарда Ніксана, аднак той сышоў у адстаўку сам.

### У Турцыі сышлі дзве лавіны, другая накрыла ратавальнікаў



Пасля другога сходу лавіны ў правінцыі Ван на паўднёвым усходзе Турцыі больш чым 30 чалавек загінулі, звыш паўсотні былі паранены. У аўторак у гэтым жа месцы сышла першая лавіна, у выніку загінулі пяць чалавек. На месца здарэння прыбыло каля 300 супрацоўнікаў выратавальных службаў. Яны знаходзіліся ў раёне катастрофы, калі сышла другая лавіна.

Турэцкая газета Hurriyet цытуе губернатара правінцыі Ван, які паведаміў, што сярод загінулых ёсць супрацоўнікі паліцыі і ахоўы, адзін пажарны і некалькі чалавек, якія не ўдзельнічалі ў выратавальных работах. Правядзенню выратавальных работ перашкаджаюць моцны туман і снег. Як паведамляецца, колькасць загінулых і параненых можа ўзрасці. Па словах міністра ўнутраных спраў Турцыі, адзін з аўтамабіляў быў выняты з-пад слоя снегу таўшчынёй каля 4-5 метраў.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне Прэзідэнту Турцыі Рэджэпу Таіпу Эрдагану ў сувязі са шматлікімі чалавечымі ахвярамі ў выніку сходу снежнай лавіны ў турэцкай правінцыі Ван.**

### Брытанія мяркуе забараніць продаж дызельных і бензінавых машын

Урад Вялікабрытаніі плануе ўвесці поўную забарону на продаж новых дызельных, бензінавых і нават гібрыдных аўтамабіляў з 2035 года, з не з 2040-га, як прапаноўвалі раней. Па словах экспертаў, перанос даты звязаны з тым, што ў адваротным выпадку Брытанія не зможа выканаць сваё абавязацельства дамагчыся практычна поўнага спынення выкіду ў атмасферу двухвокісу вугляроду да 2050-га. Пасля ўвядзення забароны можна будзе купляць толькі электрычныя і вадародныя аўтамабілі і фургоны. З гэтай ініцыятывай прэм'ер-міністр Борыс Джонсан выступіў, адкрываючы год барацьбы з кліматычнымі зменамі, які павінен скончыцца самітам ААН па клімаце, што адкрыецца ў лістападзе. Па словах Джонсана, 2020 год «стане вызначальным для клімату планеты».

# Рубель — галоўны

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Чарговы крок да дэдаларызацыі быў зроблены летам 2015 года. У многіх месцах, дзе раней гэта было дазволена, забаранілі разлічвацца замежнай валютай — напрыклад, у кавярнях і на запраўках на рэспубліканскіх аўтадарогах, у пунктах пропуску на граніцы. З таго часу нельга плаціць валютай за турыстычныя паслугі. У тым жа годзе ўлады адпусцілі курс рубля. Практычна адразу прыватныя наймальнікі пачалі масава адвязваць зарплаты ад доларавага эквіваленту, цяпер яны імкнуліся зафіксаваць свае абавязацельствы ў нацыянальнай валюце.

У 2017 годзе Нацбанк забараніў разлікі замежнай валютай з фізічнымі асобамі медыцынскім установам і авіякампаніям. Каб зрабіць беларускі рубель прывабным для ўкладчыкаў, галоўны банк краіны з ліпеня 2017 года павысіў норму адлічэнняў у фонд абавязковых рэзерваў ад прыцягнутых у замежнай валюце сродкаў з 11 % да 15 %.

## КАМУНАЛКУ ПРЫВЯЖУЦЬ ДА БАЗАВАЙ ВЕЛІЧЫНІ

«Намінаванне арганізацыямі цэн, тарыфаў, іншых плацяжоў у замежнай валюце ўносіць дысбаланс на ўнутраны валютны рынак, робячы яго адчувальным для шокаў паслаблення нацыянальнай валюты, а таксама павялічвае неабгрунтаваныя дэвальвацыйныя чаканні з боку насельніцтва», — гаворыцца ў стратэгіі. Дык вось, цяпер на ўзроўні заканадаўства неабходна адмаўляцца ад выкарыстання замежнай валюты ўнутры краіны. «Усе стаўкі падаткаў, арэнднай платы і тарыфаў дзяржаўных арганізацый будуць устанаўлівацца ў беларускіх рублях. Усе выплаты, дапамогі, субсідыі будуць ажыццяўляцца дзяржавай пераважна ў беларускіх рублях», — сцвярджае дакумент.

**Адмова ад долара не можа адбыцца толькі на паперцы з пячаткай. У першую чаргу яна павінна здарыцца ў галовах людзей.**

Дарэчы, у нашай краіне штогод павышаюць тарыфы на «камуналку», зыходзячы з прынцыпу, што сукупны плацеж не павінен перавысіць пяці долараў у разліку на тыпавую двухпакаёвую кватэру з трыма жыхарамі пры нарматыўным спажыванні імі паслуг. І вось цяпер рыхтуецца дакумент, па якім прапануецца адвязаць ад долара дзеючае абмежаванне павышэння плацяжоў насельніцтва за ЖКП. Распрацоўшчыкі падрыхтаванага праекта збіраюцца адмовіцца ад долара ў разліку іх росту і прывязаць плацяжы да базавай велічыні. Сама прывязка, мяркуецца, будзе дзейнічаць такім чынам: штогод «камуналка» павінна павышацца ў межах паловы базавай велічыні. (Цяпер базавая велічыня складае 27 рублёў, адпаведна яе палова — 13,5 рубля.)

З іншых планаў мер па дэдаларызацыі — ўнясенне змяненняў у Закон «Аб рынку каштоўных папер». Будучы дакумент прадугледжвае выпуск аблігацый, умовамі эмісіі якіх прадугледжана іх размяшчэнне на тэрыторыі нашай краіны, у беларускіх рублях. Урад таксама разглядае магчымасць унесці змены ў прэзідэнцкі Указ № 530 «Аб страхавой дзейнасці», каб выключыць магчымасць разлікаў у замежнай валюце паміж рэзідэнтамі ў страхавой сферы.

## ГАЛОЎНАЕ, КАБ РУБЕЛЬ ЗАХОЎВАЎ СТАБІЛЬНАСЦЬ

Фінансавы аналітык Жанна Кулакова лічыць, што меры па дэдаларызацыі, якія цяпер робіць урад, правільныя і доўгачаканыя. Гэта нават незразумела, калі шмат гадоў гаворыцца пра курс на дэдаларызацыю, а павышэнне платы за камунальныя паслугі лічаць у доларавым эквіваленце.

Аднак, на яе думку, адмова ад долара не можа адбыцца толькі на паперцы з пячаткай. У першую чаргу яна павінна здарыцца ў галовах людзей. Але як людзі, так і бізнес даволі часта лічаць у замежнай валюце. Цяпер трэба яшчэ вярнуць давер людзей да беларускага рубля. «Ён стаў вышэйшы, чым раней, але ўсё роўна застаецца досыць нізкі. За мінулыя гады давер быў вельмі моцна падарваны як да рубля, так і да заяў пэўных дзяржаўных экспертаў, якія абяцалі стабільнасць курсу нацыянальнай валюты», — тлумачыць спікер. З моманту апошніх непрыемных падзей, звязаных са скачкамі валютных курсаў, прайшло ўсяго пяць гадоў. Відавочна, што гэтага мала, што трэба яшчэ час. Больш таго, важна, каб на працягу гэтага часу захоўвалася стабільнасць на валютным рынку.

На думку аналітыка, трэба зрабіць так, каб курсаўтварэнне заставалася рынкавым, але пры гэтым рубель захоўваў стабільнасць. У такім выпадку ўрад будзе вымушаны выкупляць лішкі замежнай валюты на ўнутраным рынку. Яны фарміруюцца з-за таго, што людзі, прадпрыемствы і банкі прадаюць больш валюты, чым купляюць. Лішкі замежнай валюты маглі б ісці на ўмацаванне беларускага рубля. Па словах аналітыка, сітуацыя з нашымі валютнымі абавязацельствамі такая, што ўрад павінен іх выкупляць і накіроўваць альбо ў склад золатавалютных рэзерваў, альбо на пагашэнне даўгоў.

Акрамя таго, Жанна Кулакова тлумачыць, што ў нас да гэтага часу кошт буйных дарагіх пакупак часта прывязваецца да курсу долара. Можна ў прыклад прывесці жыллё — забудоўшчыкі ўстанаўліваюць цэны квадратнага метра ў доларах. Плату яны потым прымаюць у беларускіх рублях, але ўсё роўна чалавек плаціць у эквіваленце па актуальным курсе, гэта значыць, з прывязкай да замежнай валюты. Разлікі па ўсіх здзелках на другасным рынку — продажах-пакупках машын, кватэр — таксама лічацца ў доларавым эквіваленце. Гэта няправільна, але так адбываецца. Нягледзячы на тое, што пытанне па адвязцы кошту нерухомасці ад долара ўжо не раз абмяркоўвалася, асаблівых змен пакуль не назіраецца.



## АЦЭНКА ЎЗРОЎНЮ ЖЫЦЦЯ ПАВІННА БЫЦЬ У НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ВАЛЮЦЕ

Як адзначаюць фінансавыя эксперты Беларускага эканамічнага даследча-адукацыйнага цэнтра BEROC, узровень даларызацыі ў нас паступова зніжаецца, але гэта не хуткі працэс. Варта адзначыць тыя меры, якія ўжо былі прынятыя Нацбанкам. Напрыклад, зняцце валютных абмежаванняў, якія ўключаюць адмену абавязковага продажу валютнай выручкі экспарцёрамі, абавязковае прад'яўленне пашпарта фізічнымі асобамі пры куплі замежнай валюты і іншыя захады адыгралі сваю станоўчую ролю. Гэта сведчыць пра тое, што фінансавы рэгулятар упэўнены ў стабільнасці на валютным рынку.

Яшчэ адзін момант, які паказвае на тое, што ідзе дэдаларызацыя, — павелічэнне долі дэпазітаў у рублях. Валютныя ўклады насельніцтва яшчэ складаюць досыць вялікую частку ад іх агульнай колькасці. Але апошнія гады назіраецца паступовае зніжэнне гэтага паказчыка. На думку аналітыкаў, адвязка павышэння платы за ЖКП ад долара — адна з мер, якая будзе паступова прыводзіць да таго, што мы перастанем думаць у «зялёных», плануючы свае даходы і выдаткі.

Наша краіна дасягнула стабільнасці на валютным рынку. Нацыянальны банк, прымаючы такія меры, чакае, што нейкіх рэзкіх змяненняў курсу не прадбачыцца. У нас устойліва нізкія інфляцыйныя працэсы, нізкія дэвальвацыйныя працэсы — некалькі працэнтаў у год. Неабходнасць пераводзіць усё ў доларавы эквівалент як у эквівалент стабільнасці ўжо аб'ектыўна адпала. У краінах з устойлівым валютным рынкам і стабільнай манетарнай сістэмай прывязваць тарыфы, стаўкі і іншыя паказчыкі да замежнай валюты няправільна.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ДЫ «ЧХАЦЬ» НА ПАСЫЛКІ!?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Я ў адпачынку па доглядзе дзіцяці, — нібы «кодавае слова», зноў паведамляе маладая мама Таццяна Барабанава з Гомельскага раёна. — Вясной на работу ў офіс трэба выходзіць, таму паступова заказваю сабе тое-сёе з адзення з Кітая. 10 студзеня заказала блейзер. Потым пайшлі чуткі, што каранавірус можа трапіць на рэчы ў інтэрнэт-краме ад хворага прадаўца. Можа, у пасылцы зараза і яе ўвогуле нельга прыносіць дадому?

Сумненні маладых жанчын зразумелыя. Яны перастрахоўваюцца і сумняваюцца: ці забіраць заказ з пошты? Калі не пакінеш пісьмовай адмовы, кінутыя рэчы месяц паляжаць на пошце, потым аддзяленне сувязі перашле іх назад адпраўніку.

Каб не страціць заплачаныя грошы, заказчык можа схлусіць у паведамленні адпраўніку, быццам пасылка не прыйшла. Калі яе ўвогуле затрымалі і не адправілі ў тэрмін, можна і скасаваць заказ. Аднак толькі праз 20 дзён гандлёвая пляцоўка — пасярэднік паміж прадаўцом і пакупніком — апрацуе інфармацыю і верне на карту заказчыка грошы.

На гэты конт дзясяткі людзей на форумах у інтэрнэце выказваюць свае вельмі розныя меркаванні. Дарэчы, папулярная пошукавая сістэма на запыт «Каранавірус + пасылкі з Кітая» аператыўна выдае 11 мільёнаў вынікаў і больш за сем тысяч паказаў толькі гэтага даслоўнага запыту. Фразы, якія гуляюць у інтэрнэце, уразаюцца ў памяць. Многія загадзя выстаўляюць пасылкам свой дыягназ: «Прадавец, калі збіраў пасылку, мог чхнуць на рэч, адправіць вірус па пошце»; «Вы што, ужо ўсе адмовіліся ад купляў у кітайскіх інтэрнэт-крамах»; «Пасылкі з Кітая ідуць доўга, перавозяцца пры экстрэмальна нізкіх тэмпературах, але вядома, што каранавірус устойлівы да замарозкі».

Ёсць спасылкі на інтэрв'ю экспертаў, якія прыводзяць аргументы, што заразіцца, адкрыўшы пасылку, нельга. Між тым розныя крыніцы сцвярджаюць, што працягласць жыцця небяспечнага віруса — да 48 гадзін. Дарэчы, у Беларусь пасылка з Паднябеснай ідзе 3-4 тыдні — мінімум. Ёсць інфармацыя, што перад адпраўкай тавары праходзяць санапрацоўку.

І ўсё ж на форумах самы папулярны вердыкт такі: лепш перастрахавацца і цяпер увогуле не заказваць тавары з Кітая. Вопытныя карыстальнікі паслуг глабальнай віртуальнай гандлёвай пляцоўкі з КНР тлумачаць, што такая пазіцыя зразумелая з пункту гледжання захавання інтарэсаў прадаўцоў і пакупнікоў. Цяпер жа супрацоўнікі гандлёвых кампаній не могуць вярнуцца да звыклага тэмпу апрацоўкі заказа, збору пасылкі і яе адпраўкі. Заказы будуць афармлены з затрымкай, да гэтага дадасца працягласць працэсу дастаўкі, а значыць, пакупнік не атрымае пасылку ў тэрмін і зможа падаць у адрас гандлёвай пляцоўкі патрабаванне аб вяртанні грошай. Потым заказ усё ж дойдзе да адрасата, але прадавец застанецца ў мінусе.



Ці выказваюць масава карыстальнікі паслуг пошты апаску наконт бяспекі пасылак з Кітая? На гэтае пытанне адказала **дырэктар Гомельскага філіяла РУП «Белпошта» Галіна ЦЯРЭШЧАНКА:**

— Ніякіх абмежаванняў па дастаўцы пасылак з Кітая няма. Ёсць грамадзяне, якія цікавяцца ў супрацоўнікаў аддзяленняў сувязі пра сітуацыю з пасылкамі, інфармацыі паштальёнаў людзі давяраюць.

Дарэчы, адзначае кіраўнік гомельскага філіяла, за студзень на тэрыторыю Гомельскай вобласці прыйшло каля 250 тысяч паштовых адпраўленняў з КНР.

— Можна гаварыць толькі пра адзінкавыя выпадкі адмовы ад пасылак з Кітая. Калі чалавек робіць адзнаку, што не будзе забіраць адпраўленне на сваё імя, то пакунак праз месяц аўтаматычна адсылаецца адпраўшчыку назад. Апошні, адпаведна, і аплаціць кошт адваротнай перасылкі. Адпраўленне вяртаецца па той жа схеме, калі адрасат і без паведамлення не забірае пасылку на працягу месяца.

Так здараецца, што ў спісе адмоўленых і пасылкі, пра якія адрасаты банальна забываюць.

— Ведаеце, нашы карыстальнікі паштовых паслуг спачуваюць: пытаюцца, ці не баяцца паштальёны і супрацоўнікі аддзяленняў сувязі працаваць, калі штодзень праз іх праходзяць дзясяткі адпраўленняў. Мы спакойна тлумачым, чаму для хвалявання няма падставы.

У гомельскім філіяле «Белпошты» адзначаюць, што і раней хапала адмоў ад пасылак з кітайскіх сайтаў. Прычыны ў людзей розныя. Праводзіць паралель паміж пасылкамі, ад якіх адмовіліся, і сітуацыяй з каранавірусам — некарэктна. Пра такую тэндэнцыю гаварыць увогуле нельга.

Дарэчы, у Гомельскі абласны цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя не было зваротаў ад насельніцтва з просьбамі растлумачыць, ці можа пасылка з Кітая ўтрымліваць вірус і быць небяспечнай для адрасата. «Атрымальнікам пасылак вірус не пагражае», — каментуюць ва ўстанове і па поўную інфармацыю раяць звяртацца на сайт Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, дзе размешчана дакладная інфармацыя пра каранавірус.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**




## Што той інструмент, што гэты

Было гэта гады два-тры таму, калі вясна ўсё больш уступала ў свае правы, з сорамам выстаўляючы на вочы месцы, дзе тэрмінова трэба было прыбрацца, навесці парадак... Час суботнікаў, карацей.

Адзін з іх ладзіўся ў вёсцы Крупа, добра вядомай сваёй купеллю на сямі крыніцах з гаючай вадой. Туды, каб акунуцца, каб набраць вадзіцы, едзе шмат людзей. І не толькі на Вадохрышча.

Дык вось якраз там у час суботніка мы збіраліся папрацаваць. Але спачатку (усе ў рабочай вопратцы, хто з граблямі, хто з венікам, хто з сякерай ды рыдлёўкай) у пэўны час прыйшлі ў пэўнае месца. Стаім — чакаем аўтобус, які павінен завезці ў Крупу, вітаемся з новымі людзьмі, што далучаюцца да нашай кампаніі, здалёку бачым і вядомага ў раёне музыку Міхаіла Папругу. Прычым пры парадзе, як той казаў, з гармонікам.

— Вы таксама ў Крупу? — жартам пытаемся ў яго.

— Так, — на поўным сур'ёзе адказвае Міхаіл.

«Можа, яго некуды падвезці трэба?» — мільганула думка.

Аказалася — не: яму, як і многім з нас, напярэдадні патэлефанавала начальства і без лішніх падрабязнасцяў папярэдзіла, каб заўтра а восьмай раніцы быў на плошчы... Абавязкова з інструментам.

Для нашага славутага музыкі такія званкі, вядома ж, не ў навінку. Яго часта некуды запрашаюць — з інструментам, з гармонікам, значыць. Таму і гэтым разам Міхась падумаў, што яго клічуць выступіць на нейкім мерапрыемстве.

Карацей, па дарозе ў Крупу не абышлося без жартаў і смеху. Маўляў, сваёй музыкай ён будзе ствараць нам адпаведны настрой... Але ж на месцы музыка адставіў убок свой любімы інструмент, зняў святочную куртку, надзеў рабочыя пальчаткі.

Затое па дарозе назад, здавалася, сам аўтобус разам з гарманістам спяваў заліхвацкія песні!

...Дарэчы і да гонару музыканта, ён зусім не супраць быў, каб я расказала гэту гісторыю. І нават прозвішча яго назвала. Вясёлы чалавек, які любіць жарты сам, не супраць павесяліць іншых.

**Ала Альфер,**
*г. Беразіно.*

## Хто пытае, той не блукае...

Некалі даўно, у канцы 60-х гадоў мінулага стагоддзя, я зрабіла адно «вынаходніцтва», і зараз хацелася б расказаць, што мяне падштурхнула і як гэта было.

Значыць, на той час дзеткі мае ўжо трохі падраслі, пайшлі ў школу, а следам і я вырашыла паступіць у інстытут, атрымаць вышэйшую адукацыю. Падрыхтавалася да экзаменаў, паспяхова здала і — ура! — мяне залічылі на завочнае аддзяленне!

Радасці з гэтай нагоды было шмат, але ненадоўга — пакуль не даведалася, што чатыры гады нам давядзецца здаваць экзамены па замежнай мове, якая мне асабіста не давалася ну ніяк: вучу-вучу нямецкія словы, а яны адскокваюць як гарох ад сцяны! Галоўнае — з іншымі прадметамі ніякіх праблем, а вось гэты... Ну проста нейкай неадольнай гарой узвышаецца на маім шляху да дыплома.

Хоць-нехаць тады ўспомніла прымаўку, што разумны ўгару не пойдзе — стане шукаць абход. І — эўрыка! — я знайшла яго! Ведаючы, што вывучаць замежную мову мы будзем на базе газетных матэрыялаў у тысячу слоў за семестр, я купіла дзесяць аднолькавых газет (як зараз помню, «Новая Германия» за 18 верасня 1967 года), папрасіла знаёмага, які досыць добра чытаў па-нямецку, падабраць мне лягчэйшы артыкул і пісьмова перакласці яго на рускую мову. Атрыманы тэкст, як вершык, я завучыла на памяць, а ўсе словы «занесла» ў адмысловы слоўнік (ім дазвалялася карыстацца). Карацей, да экзамену я падрыхтавалася.

Убачыўшы гэта, педагог, які прымаў іспыт, застаўся задаволены і зусім не прыдзіраўся. Адно што газету маю перакрэсліў і забраў сабе. «Ну няхай, — падумала, — дома ж яшчэ дзевяць штук за тое ж 18 верасня...» І таму на іспытах, што здаваліся потым у канцы кожнага семестра, я адчувала сябе ўсё смялей і смялей, а газет, па якіх я здавала экзамены, станавілася ўсё меней і меней.

І вось нарэшце доўгачаканы фініш: зачыняючы дзверы аўдыторыі ў апошні раз, я па-нямецку сказала выкладчыкам: «Аўф відэр зеен!» (да пабачэння).

...Ці сорамна мне (было і ёсць) за сваё вынаходніцтва? Здаецца, не, бо вывучаць нямецкую мову праз 20 гадоў пасля Перамогі над фашыстамі не хацелася многім. Да таго ж, шчыра кажучы, і сэнсу ў тым амаль не было. Мы не марылі тады аб паездках у Германію і не прымалі замежных турыстаў тут.

**Міра Любаскіна,**
*г. Бабруйск.*

## Лячэнне шокам... Як токам

Не так даўно мне давялося ляжаць у бальніцы. Дні (а тым больш вечары) там, як вядома, доўгія, а размоў — дык хоць вушы затыкай!

Неяк вось гамонка зайшла пра лячэнне токам. «А можна яшчэ і **шо**кам, — засмяяўся мой сусед па ложку і потым вось што расказаў.

Яго суседка Зоя вырасла ў сям'і набожных старавераў. Бацькі не хацелі, каб яна ўступала ў піянеры, потым у камсамол. Яны, можа, і ў школу яе не пусцілі б, каб не баяліся ўлад (на той час — няхай і бязбожных).

Але ж вось вучоба скончана. Паступаць у які-небудзь інстытут або тэхнікум Зоя нават не спрабавала. Цвёрда верачы яшчэ, што ўсе людзі добрыя і сумленныя, што без Божай волі з яе галавы не ўпадзе ніводзін волас, што шлюбы ладзяцца толькі на нябёсах і г. д., яна, як параілі бацькі, уладкавалася працаваць на швейную фабрыку, засялілася ў рабочы інтэрнат. І, міма кажучы, вельмі здзівілася: амаль усе яе «сужыцелькі» — ад учарашніх школьніц да цётачак пад сорак — не баяліся выпіць-пакурыць, многія не саромеліся грубай мужчынскай лаянкі ды і нечапанак з сябе не строілі — прыводзілі да сябе хлопцаў, часам пакідалі іх назач...

**Продавец:** ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин, 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (044) 797-88-07, главный инженер – Галактионов Виктор Владимирович. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 7 февраля 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 9 марта 2020 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения. Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: произвести оплату за услуги (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи до **30 (тридцати) календарных дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

Очередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект» состоится 10 марта 2020 г. в 12.00.

Повестка дня:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2019 год и основных направлениях деятельности общества в 2020 году.
2. Отчет наблюдательного совета общества.
3. Утверждение годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности общества за 2019 год.
4. Утверждение распределения прибыли общества за 2019 год, о выплате дивидендов за 2019 год.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2020 году и первом квартале 2021 года.
6. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.

Дата составления списка акционеров для регистрации участников собрания – 10 февраля 2020 года.

Местонахождение ОАО «Гомельжилпроект»: ул. Кирова, 17, г. Гомель.

Место проведения собрания: ул. Кирова, 17, г. Гомель.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 17.02.2020 (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНП 400022625

# СКАНВОРД




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Штаб. Рвач. Кораб. Ананас. Aладкі. Сігма. Манга. Вісус. Крэсла. Авал. Бёрда. Яга. Ага. Канат. Тахта. Ёта. **Па вертыкалі:** Такса. Бурак. Арба. Нага. Рукамыйнік. Аніс. Наган. Слава. Мова. Гну. Саванё. Салата. Робат. Страх. Агат. Ёга. Ака.

Склаў
**Юрый ФАЛІНСКІ,**
*г. Мінск.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.46 | 18.01 | 9.15 |
| Віцебск — | 8.40 | 17.47 | 9.07 |
| Магілёў — | 8.37 | 17.52 | 9.15 |
| Гомель — | 8.28 | 17.53 | 9.25 |
| Гродна — | 9.01 | 18.17 | 9.16 |
| Брэст — | 8.57 | 18.23 | 9.26 |

## Месяц

*Першая квадра 2 лютага.*
*Месяц у сузор'і Рака.*

## Імяніны

**Пр.** *Аляксандра, Анатоля, Віталя, Майсея, Піліпа, Пятра, Рыгора, Уладзіміра, Фелікса.*
**К.** *Рамуальда, Рышарда.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




# Даты | Падзеі | Людзі

## 7 ЛЮТАГА




**1915** год — нарадзіўся Мікалай Трафімавіч Маструкоў, удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1944 г., пасмяротна). Ваяваў на Заходнім, Паўднёва-Заходнім, Цэнтральным, Беларускім франтах. Удзельнік баёў пад Масквой. Камандзір кавалерыйскага эскадрона лейтэнант Маструкоў асабліва вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра ў Камарынскім раёне. Загінуў у 1943 годзе.



**1925** год — нарадзілася Людміла Іванаўна Сторажава, актрыса, заслужаная артыстка Беларусі (1966). З 1959 года служыла ў Брэсцкім, з 1962-га — у Гродзенскім, у 1968—1974 гадах — у Гомельскім абласных драматычных тэатрах. Выканаўца драматычных і характарных роляў. Найбольш з іх — Ганна Карэніна («Ганна Карэніна» Льва Талстога), Манахава («Варвары» Максіма Горкага), Клеапатра («Антоній і Клеапатра» Уільяма Шэкспіра).

**1945** год — нарадзіўся Аляксандр Іванавіч Марцынюк, акцёр, заслужаны артыст Беларусі (1991). З 1969 года служыў у Беларускім рэспубліканскім тэатры юнага гледача, з 1976-га — у Гродзенскім абласным драматычным тэатры. Сярод роляў — Куторга («Пінская шляхта» Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча), Алег Кашавой («Маладая гвардыя» Аляксандра Фадзеева) і іншыя.




**1855** год — у горадзе Сімода адміралам Яўхім Пуцяціным падпісаны першы руска-японскі дагавор. Паводле дамовы, усталёўваўся «пастаянны мір і шчырае сяброўства паміж Расіяй і Японіяй». Для рускіх суднаў былі адкрыты парты Сімода, Хакадатэ і Нагасакі. У першых двух дазваляўся ўзаемны гандаль і ў адным з гарадоў магло быць адкрыта рускае консульства. Да Японіі адышла паўднёвая частка Курыльскіх астравоў, а востраў Сахалін заставаўся ў сумесным валоданні.

**1870** год — нарадзіўся Пётр Бернгардавіч Струвэ, рускі эканаміст, філосаф, гісторык і публіцыст, тэарэтык «легальнага марксізму».



**1920** год — Чырвонай Арміяй вызвалена ад белагвардзейцаў Адэса.

**1960** год — нарадзіўся Джэймс Спэйдар, амерыканскі кінаакцёр. Здымаўся ў фільмах «Секс, хлусня і відэа», «Благі ўплыў», «Воўк», «Аўтакатастрофа» і іншых.

**1960** год — нарадзіўся Дзітэр Болен, нямецкі поп-музыкант (гурты Modern Talking, Blue System).

**1964** — гурт The Beatles прыбыў у Нью-Ёрк, дзе ў аэрапорце імя Кенедзі яго сустракалі тры тысячы прыхільнікаў. Гісторыкі поп-культуры потым назвалі гэты дзень пачаткам «брытанскага ўварвання» ў Амерыку.

## УСМІХНЕМСЯ

Адны і тыя ж рэчы часта выглядаюць зусім па-рознаму, калі глядзець на іх з розных бакоў. Вось выхадныя, напрыклад, выглядаюць папрознаму ў пятніцу ўвечары і ў панядзелак раніцай.

**— Мне бульбы не трэба, мамачка, мне трэба пустую талерку, поўную катлет!**

Адзін сусед кажа другому:

— Вырашыў праверыць словы пра тое, што калі шчыльна паесці і пайсці ў супермаркет, то купляць ежу не будзе жадання. І ты ведаеш, сапраўды! Гляджу на ежу — нічога не хочацца. Вось узяў каньяк.

**Строга асудзіў сябе. Але прыняўшы пад увагу ўсе змякчальныя акалічнасці, абмежаваўся строгай вымовай.**

У адных брушны прэс кубікамі, у іншых — купалам.





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 374.

Нумар падпісаны ў 19.30 6 лютага 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
7 лютага 2020 г. № 5 (541)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ЭКСПЕРТНЫ АСЯРОДАК




# РЭГІЯНАЛЬНЫЯ ДРАЙВЕРЫ РОСТУ ЦІ ДОНАРЫ?

**Асноўная частка беларусаў абірае буйныя гарады для камфортнага жыцця. Гараджанамі сёння могуць назваць сябе амаль 7,5 мільёна нашых суайчыннікаў, а вяскоўцамі — каля двух мільёнаў. Такі разрыў зразумелы — у буйных цэнтрах лягчэй знайсці работу, узровень і якасць жыцця лепшыя, ёсць развіццё тэрыторый... Усё гэта большай часткай характэрна для абласных цэнтраў, магчымасці малых і сярэдніх гарадоў больш сціплыя. Таму зразумела, чаму ўлады паставілі перад сабой задачу развіцця эканомікі гэтых рэгіёнаў, каб скараціць разрыў у якасці жыцця насельніцтва. Акцэнт зроблены на 11 гарадах краіны з насельніцтвам больш за 80 тысяч чалавек, дзе ў бліжэйшыя гады павінна быць забяспечана паскоранае сацыяльна-эканамічнае развіццё. У спіс гарадоў, якім нададуць «другое дыханне», увайшлі Баранавічы, Пінск, Наваполацк, Полацк, Орша, Мазыр, Ліда, Барысаў, Салігорск, Маладзечна і Бабруйск.**

Ці можна разглядаць гэтыя населеныя пункты ў якасці не толькі драйвера рэгіянальнага развіцця, але і донара для сумежных тэрыторый? Якім чынам можна замацаваць людзей на перыферыі? Якія праблемы мясцовага самакіравання сёння існуюць? Адказы на гэтыя і іншыя пытанні шукалі ўдзельнікі круглага стала, які прайшоў у прэс-цэнтры БелТА з ініцыятывы беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў (далей — БІСД) на тэму «11 цэнтраў прыцягнення — рэгіянальныя драйверы росту».
У якасці экспертаў запрасілі старшыню Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіла РУСАГА, старшыню Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па аграрнай палітыцы Мікалая ШАЎЧУКА, дырэктара БІСД Алега МАКАРАВА, намесніка дырэктара БІСД Юрыя ПРАКОПАВА, аналітыка гэтага інстытута Андрэя ЧАРНАБАЯ і дырэктара даследчага цэнтра ІПМ (які займаецца даследаваннямі, прагнозамі, маніторынгамі) Аляксандра ЧУБРЫКА.

стар. 4, 13

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Парламенцкая дыпламатыя



У Савеце Рэспублікі прайшлі сустрэчы з шэрагам кіраўнікоў дыпламатычных місій у Мінску.

стар. 2

### Падтрымаць ініцыятыву



Старшыня Гродзенскага абласавета дэпутатаў Ігар Жук адказаў на пытанні жыхароў рэгіёна.

стар. 14

### Дапаможам, чым зможам



Ніводзін зварот да сенатараў падчас прамых ліній і прыёмаў грамадзян не застанецца без увагі.

стар. 14

### Вялікія магчымасці



Як у датацыйным раёне змаглі ажыццявіць 12 мясцовых ініцыятыў, даведаліся старшыні Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню Гомельшчыны.

стар. 15

### Каб не павесілі замок



Жыхары Бабіч, што на Брэстчыне, не хочуць страціць адзіную ў вёсцы грамадскую установу.

стар. 16

НА ПАРАДКУ ДНЯ

# НАСУСТРАЧ АДНО АДНАМУ

## У беларускім парламенце створаць рабочую групу па ўзаемадзеянні з Кангрэсам ЗША

**Пра гэта паведаміў журналістам старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў, паведамляе БелТА.**

Парламентарый адзначыў пастъупальны працэс нармалізацыі беларуска-амерыканскіх адносін, у якім зацікаўлены абодва бакі. «Мы заўсёды падкрэслівалі і падкрэсліваем, што выступаем за канструктыўны і раўнапраўны дыялог з ЗША, за пашырэнне супрацоўніцтва па ўсіх кірунках і пытаннях, што ўяўляюць узаемную цікавасць. У тым ліку мы гатовыя і да паглыблення адносін на міжпарламенцкім узроўні. Дастаткова сказаць, што цяпер завяршаецца фарміраванне рабочай групы па ўзаемадзеянні з Кангрэсам ЗША», — праінфармаваў Сяргей Рачкоў.

Такая група ў беларускім парламенце будзе створана ўпершыню. У яе ўвойдуць як члены Савета Рэспублікі, так і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. «Мы гатовыя абмяркоўваць з калегамі абсалютна ўсе пытанні», — падкрэсліў старшыня пастаяннай камісіі.

Сяргей Рачкоў звярнуў увагу, што дыялог паміж Беларуссю і ЗША не спыняўся нават у самыя складаныя для двухбаковых адносін часы. Працягваўся ён і паміж заканадаўчымі органамі. Так, Беларусь неаднаразова наведвалі амерыканскія парламенцкія дэлегацыі. Яны сустракаліся з Прэзідэнтам, прадстаўнікамі ўрада, калегамі з Савета Рэспублікі. Па словах сенатара, у Беларусі зацікаўленыя ў арганізацыі новага візіту амерыканскіх кангрэсменаў. «Мы хацелі б працягваць сустрэчы з нашымі калегамі і абмяркоўваць самыя складаныя пытанні. Ёсць пэўныя абмежаванні, якія выбудаваны не намі, не беларускім бокам. Спадзяёмся, што яны будуць паступова здымацца, мы будзем лепш і лепш разумець адно аднаго, працаваць над канструктыўным і пазітыўным двухбаковым парадкам дня».

Сведчаннем нармалізацыі, паступальнага развіцця беларуска-амерыканскіх адносін, на думку Сяргея Рачкова, з'яўляюцца візіты ў Беларусь дарадцы Прэзідэнта ЗША па нацыянальнай бяспецы Джона Болтана, намесніка дзяржаўнага сакратара ЗША па палітычных справах Дэвіда Хэйла. Яны прыязджалі ў Мінск у жніўні і верасні 2019 года адпаведна. Днямі беларускую сталіцу наведаў дзяржсакратар ЗША Майкл Пампеа.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# ПАРЛАМЕНЦКАЯ ДЫПЛАМАТЫЯ

**Істотны ўнёсак ва ўмацаванне двухбаковага супрацоўніцтва з замежнымі краінамі робіць парламенцкая дыпламатыя, у тым ліку сустрэчы сенатараў з акрэдытаванымі ў Беларусі пасламі. Днямі старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава сустрэлася з шэрагам кіраўнікоў дыпламатычных місій у Мінску.**



Фота БелТА.

## Форум — зона адказнасці сенатараў

Спікер верхняй палаты парламента сустрэлася з паслом Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Дзмітрыем Мезенцавым. Падчас размовы з паслом былі абмеркаваны бягучыя пытанні двухбаковых адносін. У прыватнасці, прадметна гаварылі аб пашырэнні міжпарламенцкага ўзаемадзеяння. Суразмоўцы таксама закранулі тэму падрыхтоўкі VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Між іншым, аргкамітэт па яго правядзенні ўзначальвае намеснік старшыні Савета Рэспублікі Анатоль Ісачанка. Форум сёлета восенню прымуць Мінск і Мінская вобласць. Нагадаем, такія форумы зарэкамендавалі сабе выдатнай формай развіцця прамых кантактаў і сувязяў паміж рэгіёнамі, сталі моцным стымулам паглыблення супрацоўніцтва. Праводзяцца яны штогод пад эгідай беларускага Савета Рэспублікі і расійскага Савета Федэрацыі. Яны стварылі сумесную міжпарламенцкую камісію па міжрэгіянальным супрацоўніцтве. Сёння, дарэчы, у Савеце Рэспублікі пад кіраўніцтвам Наталлі Качанавай пройдзе першае пасяджэнне арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

## Сур'ёзны палітычны дыялог

Наталля Качанава правяла сустрэчу з паслом Рэспублікі Балгарыя ў Рэспубліцы Беларусь Георгі Васілёвым. У цэнтры ўвагі былі пытанні міжпарламенцкага, гандлёва-эканамічнага і гуманітарнага супрацоўніцтва. Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што адносіны з Балгарыяй актыўна развіваюцца. Вельмі важна, што ў апошнія гады аднавіўся сур'ёзны палітычны дыялог. Яна адзначыла, што Беларусь зацікаўлена ва ўмацаванні міжпарламенцкіх кантактаў з Балгарыяй.

Наталля Качанава звярнула ўвагу на станоўчую дынаміку тавараабароту паміж краінамі. За студзень—лістапад 2019 года аб'ём узаемнага гандлю вырас на 10,4 % у параўнанні з аналагічным перыядам 2018 года. Развіваецца рэгіянальнае супрацоўніцтва, пабрацімскія сувязі маюць больш за 40 гарадоў.

— Думаю, у нас добрыя перспектывы, — выказала ўпэўненасць старшыня Савета Рэспублікі.

Як адзначыў пасля сустрэчы ў размове з журналістамі Георгі Васілёў, Беларусь і Балгарыя маюць вялікі патэнцыял для развіцця супрацоўніцтва. На яго погляд, варта практыкаваць новыя падыходы партнёрства. Напрыклад, у Балгарыі высока ацэньваюць узровень развіцця беларускага IT-сектара. Таму, лічыць пасол, трэба актывізаваць двухбаковае ўзаемадзеянне ў гэтай сферы.

## Плён міжпарламенцкага ўзаемадзеяння

Наталля Качанава сустрэлася з паслом Рэспублікі Арменія ў Рэспубліцы Беларусь Арменам Гевандзянам.

Па яе словах, найбольш паспяховым прыкладам узаемадзеяння з'яўляецца партнёрства паміж парламентамі Беларусі і Арменіі. Створана і паспяхова працуе міжпарламенцкая камісія, адбылося ўжо 12 пасяджэнняў. Летась камісія збіралася ў Ерэване, сёлета сустрэча пройдзе ў Мінску. Наталля Качанава падкрэсліла, што ў Беларусі высока цэняць узровень палітычнага дыялогу, які склаўся паміж краінамі.

У цэлым беларуска-армянскія адносіны заснаваны на дружбе народаў, а таму і супрацоўніцтва, напрыклад у гандлёва-эканамічнай сферы, дынамічна развіваецца, адзначыла старшыня Савета Рэспублікі.

— Хацелася б у гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве бачыць цэлы шэраг новых праектаў, якія былі б выгадныя Беларусі і Арменіі. Гэта датычыцца і паставак гарадскога пасажырскага транспарту. Ведаю, што ўжо заключаны дагаворы з беларускімі прадпрыемствамі па замене ліфтаў у Ерэване, — звярнула яна ўвагу.

Арменія пакуль не ўваходзіць у спіс асноўных знешнегандлёвых партнёраў Беларусі, як і Беларусь не належыць да вядучых партнёраў Арменіі. Але будзем спадзявацца, што гэта з'ява часовая. У двух краін ёсць велізарныя магчымасці для развіцця ўзаемавыгаднага гандлю, супрацоўніцтва ў прамысловасці і навуцы, сельскай гаспадарцы, перапрацоўчай галіне і інфармацыйных тэхналогіях.

Пра гэта сведчыць статыстыка. У 2017 годзе аб'ём двухбаковага тавараабароту склаў 42,7 мільёна долараў (132,9 % да ўзроўню 2016 года). Па выніках 2018 года тавараабарот перавысіў 50 мільёнаў долараў (117,3 % да ўзроўню папярэдняга перыяду). За студзень—лістапад 2019 года аб'ём узаемнага гандлю паміж краінамі склаў 63,7 мільёна долараў і вырас у параўнанні з аналагічным перыядам 2018 года на 39 %.

Арменія набывае ў нашай краіны машыны, трактары, будаўнічую і сельскагаспадарчую тэхніку, запчасткі, лекі, запалкі, пластмасавыя вырабы, пакрыўкі, драўляныя будматэрыялы, кабель, трыкатажныя вырабы і іншыя тавары. У Беларусь ідуць напоі, мінеральныя воды, тавары хімічнай вытворчасці, электратэхнічнае абсталяванне, трансфарматары і іншыя тавары. У ліпені 2012 года ў Мінску адкрылася сумесная вытворчасць па разліве якасных армянскіх каньякоў.

У цэлым Беларусь гатова да далейшага супрацоўніцтва з Арменіяй па ўсіх кірунках, канстатавала ў ходзе размовы з паслом старшыня Савета Рэспублікі.

— Я хачу запэўніць, што парламентарыі, члены Савета Рэспублікі зробяць усё для таго, каб нашы добрыя адносіны развіваліся ў далейшым, — сказала Наталля Качанава.

Суразмоўцы падкрэслілі, што важную ролю ва ўмацаванні двухбаковага супрацоўніцтва адыгрываюць беларуска-армянская міжурадавая камісія па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве (праведзена 13 пасяджэнняў), беларуска-армянская міжурадавая камісія па ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве (праведзена 3 пасяджэнні), сумесная беларуска-армянская камісія па пытаннях навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва.

Пасол у гутарцы з журналістамі падкрэсліў, што ў рамках вышэйзгаданай міжпарламенцкай камісіі абмяркоўваецца шырокае кола пытанняў — ідзе размова і аб садзейнічанні парламентарыяў развіццю эканамічных сувязяў паміж Беларуссю і Арменіяй.

У прыватнасці, Армен Гевандзян лічыць, што і ў Арменіі, і ў Беларусі робіцца вялікая стаўка на чалавечы капітал. Адсюль і актуальнасць узмацнення ўзаемадзеяння ў сферы высокіх тэхналогій. Надышоў час актывізаваць сумесную дзейнасць профільных кампаній, наладзіць абмен досведам, выкарыстоўваць напрацоўкі, якія ёсць у парку «Вялікі камень» і Парку высокіх тэхналогій. Гэта можа значна павялічыць аб'ёмы двухбаковага тавараабароту, адзначыў дыпламат.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# Выкуп будынка і зямельны канфлікт

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл Русы правёў асабісты прыём грамадзян. Пытанні, з якімі звярнуліся людзі, датычыліся зямельных адносін і судовых спрэчак, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.**



Напрыклад, жыхарка Быхаўскага раёна прасіла пасадзейнічаць з выкупам аднаго з пустых будынкаў бальнічнай установы, які ў свой час яна ўзяла ў арэнду і ўладкавала для развіцця аграэкатурызму. «Гэта быў стары дом, вы прывялі яго ў парадак, сюды ездзяць адпачываць людзі, тэрыторыя развіваецца. Мы ўжо звярнуліся з гэтым пытаннем у Дзяржкаммаёмасць, думаю, зможам вам дапамагчы», — адзначыў Міхаіл Русы.

На прыём таксама прыйшла жыхарка сталіцы і звярнулася з просьбай разабрацца ў заблытанай сітуацыі з вызначэннем межаў зямельнага ўчастка для абслугоўвання жылога дома, які дастаўся ёй у спадчыну ад маці ў Кіраўскім раёне. Судовыя цяжбы цягнуцца ўжо некалькі гадоў. Межы зямельнага ўчастка сталі прычынай сур'ёзнага канфлікту з суседзямі. Бакі звярталіся ў розныя ведамствы, аднак кропку ў справе не могуць паставіць да гэтага часу. Міхаіл Русы ўважліва вывучыў усе дэталі канфлікту, паабяцаў разабрацца і даць адказ. «Мы звернемся ў Кіраўскі райвыканкам, вывучым сітуацыю і дадзім адказ, ацэнім, што можна зрабіць у рамках дзеючага заканадаўства», — адзначыў старшыня Пастаяннай камісіі.

У цэлым Міхаіл Русы звярнуў увагу на тое, што многія пытанні, з якімі прыходзяць людзі, могуць вырашацца на месцах. «Трэба праводзіць тлумачальную работу, падказваць, што можа зрабіць чалавек у пэўнай сітуацыі, куды яму звярнуцца, каб вырашыць праблему», — падсумаваў ён.

# УСЁ ПАВІННА РАБІЦЦА ДЛЯ ЧАЛАВЕКА І ІСЦІ АД ЖЫЦЦЯ

## Спікер верхняй палаты парламента ацаніла новыя аб'екты Магілёва і сустрэлася з дэпутацкім актывам рэгёна

**За апошні час Магілёў істотна змяніўся: з'явіліся новыя сацыяльныя і культурныя аб'екты, больш дасканалая стала інфраструктура. І працэс працягваецца — будуюцца жыллё, паліклінікі, новыя дарогі. Сёння мікрараён Казіміраўка ў Магілёве — адзін з самых перспектыўных. Летась тут была ўведзена ў эксплуатацыю сучасная школа № 46 з начыннем па апошнім слове ІТ-тэхнікі. Менавіта з наведвання гэтага аб'екта і пачалі свой рабочы візіт у Магілёў старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА і старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Міхаіл РУСЫ.**



### Магілёву надалі глянцу

Новая ўстанова адукацыі сапраўды ўражвае. Інтэрактыўныя дошкі, мультыборды, у настаўнікаў на сталах камп'ютары, у вучняў — электронныя дзённікі. Такая школа чацвёртая ў краіне пасля Мінска, Бабруйска і Крычава. Але са сваімі мясцовымі адметнасцямі. У фае на ўсю сцяну мастацкае пано з усімі тутэйшымі славутасцямі — ратушай, ільвамі на мосце праз Дняпро, уязной аркай, астролагам на плошчы Зорак...

— Самае галоўнае, што нашы будаўнікі прыклалі шмат намаганняў, каб здаць гэтую школу датэрмінова — да 1 верасня, — прадставіў яе высокім гасцям **мэр Магілёва Уладзімір ЦУМАРАЎ**. — Па нарматывах яе павінны былі здаць толькі сёлета ў сакавіку. Але мы разумелі, наколькі важны для горада аб'ект. Мікрараён вялікі, перспектыўны. Школа ўжо стала цэнтрам прыцягнення ўсіх жыхароў Казіміраўкі. Па вечарах тут зусёды шмат людзей, школьны спартыўны гарадок і будаваўся з разлікам на насельніцтва мікраараёна.



Спікер парламента завітала на ўрок.

Наталля Качанава і Міхаіл Русы прайшліся па будынку ў суправаджэнні **губернатара вобласці Леаніда ЗАЙЦА** і іншых прадстаўнікоў мясцовай улады і ведамстваў. Спікер парламента пагутарыла з настаўнікамі, спыталася, як ім працуецца ў новай школе. На ўроку ў першакласнікаў пацікавілася, якія прадметы яны вывучаюць.

— І беларускую мову таксама? — спыталася яна ў дзятвы.

— Так, — хорам адказалі яны.

— А ці падабаецца яна вам?

— Вельмі!

На пытанне Наталлі Качанавай, як выконваюцца даручэнні Прэзідэнта па наданні Магілёву «глянцу», губернатар вобласці Леанід Заяц далажыў пра ўсе тыя змены, якія ўжо адбыліся і якія яшчэ чакаюць Магілёў у найбліжэйшай будучыні. Гэта будаўніцтва новых важных спартыўных і медыцынскіх аб'ектаў, а таксама дубль-трасы, якая разгрузіць перапоўненую сёння Мінскую шашу і вуліцу Якубоўскага. Горад пасля гэтага ўздыхне на поўныя грудзі, падкрэсліў губернатар.

### На будаўніцтве паліклінікі працуюць нават ноччу

Хутка ў Казіміраўцы з'явіцца вельмі запатрабаваная жыхарамі паліклініка — таксама передавая і сучасная. Будаўнічая пляцоўка стала наступным аб'ектам наведвання. Яе ўзвядзеннем займаецца будтрэст № 12. Паліклініка таксама будуецца з апярэджаннем тэрмінаў. Работы вядуцца нават па начах, але, як запэўнілі прадстаўнікі мясцовай улады, ніводнай скаргі не паступае. Народ чакае гэтую паліклініку і церпіць часовыя нязручнасці.

— Гэта будзе цэлы камбінаваны комплекс для аказання першаснай медыцынскай дапамогі, — паведаміў **начальнік упраўлення аховы здароўя Магілёўскага аблвыканкама Аляксандр СТАРАВОЙТАЎ**. — Тут сабраны ўсе найноўшыя тэхналогіі, якія датычацца арганізацыі амбулаторна-паліклінічнай дзейнасці. Зручнасць паліклінікі заключаецца ў тым, што 37 тысяч жыхароў Магілёва, якія будуць тут абслугоўвацца, атрымаюць дапамогу ў поўным аб'ёме. Не спатрэбіцца дзецям хадзіць у адзін бок, дарослым — у другі: усё будзе засяроджана ў адным будынку. Тут жа размесціцца падстанцыя хуткай медыцынскай дапамогі, чатыры медыцынскія брыгады якой будуць аказваць экстранную дапамогу жыхарам раёна. Кошт паліклінікі складзе 48 мільёнаў рублёў, з якіх 19 мільёнаў пойдзе на закупку самага сучаснага абсталявання. Адкрыццё запланавана на лістапад.

Наталля Качанава ацаніла і новы паветраапорны футбольны манеж на базе ДЮСШАР № 7, пабудаваны ў Магілёве таксама з апярэджаннем тэмпаў.

— Летась у адпаведнасці з даручэннямі кіраўніка дзяржавы мы яго адкрылі, — удакладніў мэр Магілёва Уладзімір Цумараў. — Гэта вельмі добры комплекс для дзяцей. Усе ўмовы для развіцця гэтага віду спорту мы стварылі. Летам таксама адкрылі крытыя тэнісныя корты з трыбунамі — зрабілі ўсё для таго, каб чалавек мог развівацца і весці здаровы лад жыцця.

**На ўроку ў першакласнікаў Наталля Качанава пацікавілася, якія прадметы яны вывучаюць.**

**— І беларускую мову таксама? — спыталася яна ў дзятвы.**

**— Так, — хорам адказалі яны.**

**— А ці падабаецца яна вам?**

**— Вельмі!**

Акрамя таго, летась у цэнтры Магілёва быў урачыста адкрыты вялікі шматфункцыянальны комплекс — дзесяціпавярховы гандлёва-дзелавы цэнтр «Атрыум» агульнай плошчай 43 тысячы квадратных метраў. Пад адным дахам знаходзяцца крамы, кіназалы, забаўляльны комплекс, чатырохзоркавая гасцініца са спа-цэнтрам і фітнес-залай.

— Мы яшчэ памятаем той стары сціплы будынак Дома быту, які быў на гэтым месцы. Ён функцыянаваў з 1973-га і ўжо маральна састарэў, — кажа Уладзімір Цумараў. — У 2008 годзе мы знайшлі інвестара, які абяцаў надаць старому будынку новы выгляд, але працэс з-за фінансавай нестабільнасці кампаніі на некалькі гадоў прыпыніўся. Будынак вярталі праз гаспадарчы суд. У 2014 годзе для яго знайшоўся новы інвестар, які ўсе свае абавязацельствы выканаў. Сёння мы маем сучасны гандлёва-дзелавы цэнтр з гасцініцай.

**Кіраўнік гатэля Таццяна ФІЛІПАВА** паведаміла, што адна з галоўных мэт іх установы — павысіць экспарт турыстычных паслуг і ўзровень сэрвісу. Гасцінічныя нумары займаюць аж сем паверхаў — з чацвёртага да дзясятага.

— Мы сябе пазіцыянуем як бізнес-атэль, мэтавая аўдыторыя якога бізнес-турысты, — удакладніла Таццяна Філіпава.

Падводзячы вынікі знаёмства з аб'ектамі Магілёва, Наталля Качанава падкрэсліла, што яны яе прыемна ўразілі.

— Прэзідэнт краіны некалькі гадоў таму даў даручэнні па развіцці горада, і гэта знаходзіцца на кантролі ў Адміністрацыі Прэзідэнта, — рэзюмавала яна. — Таму падчас выязной сустрэчы з дэпутацкім корпусам я для сябе вырашыла пераканацца, як выконваюцца гэтыя даручэнні. Зроблены істотныя крокі ў развіцці горада. Самае галоўнае, што ўсе гэтыя перамены ішлі ад жыцця. Неабходна было рабіць транспартныя развязкі, рамантаваць пуцеправоды, і гэтая работа вядзецца. У скарочаныя тэрміны ўводзяцца сацыяльныя аб'екты. Мяне вельмі ўразіла школа, пабудаваная раней, чым запланавана. Я спадзяюся, што ўсе даручэнні, якія былі дадзены Прэзідэнтам, будуць выкананы ў кароткія тэрміны. Па шэрагу аб'ектаў мы бачым, што гэта рэальна.

### З клопатам пра людзей

Падчас сустрэчы з актывам гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў Наталля Качанава звярнула ўвагу на важнасць іх работы на месцах. У размове з журналістамі яна адзначыла, як будуецца ўзаемадзеянне Савета Рэспублікі з дэпутатамі розных узроўняў.

— Мы выбралі такую форму работы, як выезд у рэгіёны і сустрэча з кіраўнікамі Саветаў дэпутатаў на месцах, — паведаміла яна. — Я нагадваю пра задачы, якія вызначыў Прэзідэнт, выступаючы перад парламентарыямі 5 снежня, і якія абазначаны ў заканадаўчых актах для Савета Рэспублікі. Я праводзіла падобную сустрэчу ў Віцебскай вобласці і пераканалася, што тыя людзі, якія працуюць на месцах, глыбока ведаюць існуючыя там праблемы. Але ведаць пра іх — мала, іх яшчэ трэба вырашаць. І сумесная дэпутацкая работа з органамі ўлады вельмі патрэбна. У Савеце Рэспублікі дзейнічае Савет па ўзаемадзеянні з органамі мясцовага кіравання. Важна, каб тыя пытанні, якія ўзнікаюць у людзей, былі своечасова пастаўлены перад тымі, ад каго залежыць іх вырашэнне. Заканадаўча ў нашай краіне ўсе пытанні ўрэгуляваныя, зроблены захады для развіцця ўсіх галін гаспадарання. Выразна вызначаны ўсе задачы і кірункі ў развіцці, застаецца толькі іх рэалізоўваць. А вось як мы робім гэта на месцах, так і складваецца работа. Дэпутацкі корпус нашай краіны нацэлены на тое, каб усе задачы, якія былі пастаўлены, вырашаліся своечасова. І той лозунг, які пазіцыянуе наш Прэзідэнт, — галоўнае — людзі і справядлівыя адносіны да іх — быў у поўнай меры рэалізаваны.

Падчас размовы з дэпутатамі спікер парламента звярнула ўвагу на тое, што для прыняцця правільных законаў патрэбна іх ініцыятыўнасць на месцах. «І планы трэба распрацоўваць не на год, а адразу на пяцігодку. І не баяцца выступаць з прапановамі», — падкрэсліла яна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота БелТА.**

# РЭГІЯНАЛЬНЫЯ ДРАЙВЕРЫ

## Праблематыка развіцця



**Алег МАКАРАЎ:** Пытанні, якія для нас важныя ў гэтым праекце: наколькі сістэма кіравання можа быць мабілізаваная для вырашэння буйной дзяржаўнай задачы? Які будзе наступны крок пасля яе выканання? Мы рухаемся да мэт устойлівага развіцця, да паскоранага развіцця па фронце ці наступаем на нейкіх асноўных кірунках? Гэта другая тэма, якая мае для нас значэнне. Трэцяя тэма — гарады разглядаюцца як драйверы ці як донары (тыя элементы, якія потым будуць аддаваць)? Яшчэ адным пытаннем з'яўляюцца метады вырашэння задач: мы прызвычаіліся гэта рабіць за кошт высокага адміністрацыйнага ціску. А ці зможам праз нейкі перыяд развіцця гэтага праекта назіраць элементы самаразвіцця, элементы таго, што не трэба засяроджваць высілкі на тым, каб зрабіць кожны крок у вырашэнні задач па 11 гарадах? Вось такія пытанні, якія для нас як інстытута стратэгічных даследаванняў з'яўляюцца важнымі.



**Міхаіл РУСЫ:** Чым павінны стаць 11 гарадоў і рэгіёнаў? Драйверамі. У нас такі тэрмін — пункты росту. Так, яны пакуль і не донары, калі браць асобна, і не драйверы, і ёсць элементы, дзе з імі трэба па цэлым шэрагу прадпрыемстваў працаваць, каб яны выйшлі на гэтыя паказчыкі. Але тут існуюць чалавечы рэсурс, выдатная інфраструктура (транспартная, лагістычная, гандлёвая, прамысловая), вельмі моцныя прадпрыемствы, якія здольныя і ўжо генеруюць той аб'ём сродкаў, што дазволіць ім стаць пунктамі росту ці донарамі на сумежныя тэрыторыі. Іх не трэба разглядаць асобна. Я прывяду некалькі прыкладаў. Мазыр і раён пачалі атрымліваць развіццё. Я вылучу асобна прадпрыемства «Зара», якое, ствараючы пад сябе базы (два свінаводчыя комплексы, МТФ), размясціла іх на землях Нараўлянскага раёна, у якога пакуль недастаткова рэсурсаў, але ёсць зямля і жаданне развівацца. Літаральна за кароткі перыяд Нараўлянскі раён стаў пунктам прыцягнення працоўнай сілы: ёсць рабочыя месцы, заработная плата, умовы для жыцця. Праз гэты элемент рэгіён стаў донарам для далейшага развіцця.

Што датычыцца драйвераў, возьмем Бабруйск. Мы звярнулі сур'ёзную ўвагу на цэлы шэраг прадпрыемстваў, у тым ліку і праблемных, напрыклад «Белшыну», вызначылі крыніцы і магчымасці іх развіцця. Я называў бы разумным падыход, каб разглядаць «Белшыну» і спадарожныя прадпрыемствы як адно цэлае. Яны дадуць сыравіну для вытворчасці і, адпаведна, будуць выкарыстоўваць выробленую прадукцыю.

Трактарны завод цяпер размяшчае ў Бабруйску вытворчасць для забеспячэння сваіх патрэб. У Магілёве пачаў працаваць «Омсккарбон» — асноўная крыніца забеспячэння сыравінай «Белшыны». Гэта значыць, нам трэба разглядаць цэлы комплекс пытанняў. Далі развіццё ў Бабруйску «Чырвонаму харчавіку», ён стаў донарам для Слаўгарадскага раёна. Літаральна сёлета будзе запушчана ўнікальная вытворчасць па выпуску больш чым 3,5 тысячы тон мармеладу, з'явіцца 100 рабочых месцаў. Гэтыя раёны — і пункты прыцягнення эканомікі, і пункты развіцця іншых тэрыторый. Буйныя драйверы павінны быць, але разам з імі неабходна разглядаць і донарства на сумежныя тэрыторыі.

Наша задача (мясцовых органаў улады, парламента) стварыць умовы і вывучыць, чаго яшчэ не хапае. У прынцыпе, у нас і заканадаўчай базы, і нарматыўна-прававой дастаткова, каб забяспечыць неабходныя ўмовы для жыцця. Але што яшчэ перашкаджае? Таму самае галоўнае — у межах такіх круглых сталоў, вывучэння меркаванняў насельніцтва, органаў кіравання, суб'ектаў гаспадарання выпрацаваць падыход, які дапаможа зняць бар'еры. А праз год вывучыць, што атрымалася, а што не. Ёсць шмат пытанняў, нестыковак мясцовых органаў улады і прадпрыемстваў рэспубліканскай формы ўласнасці. Напрыклад, губернатар хоча рухацца далей, а міністра задавальняе тэмп росту 101—102 %. Тут трэба здымаць перашкоды і сумесна адпрацоўваць падыходы як адзін з элементаў стварэння ўстойлівага развіцця рэгіёна.

## Адукацыя, ахова здароўя, лагістыка...



**Юрый ПРАКОПАЎ:** Аляксандр, вы даўно вывучаеце тэму рэгіянальнага развіцця. Наколькі я ведаю, вы правялі параўнальны аналіз дэмаграфічных змен, неаднолькавасці эканамічнага развіцця рэгіёнаў. Зыходзячы з вашай ацэнкі працэсаў, ці бачыце вы праблему рэалізацыі гэтага маштабнага праекта? Ці, наадварот, тое, што робяць улады, паказвае, што пункты выбраны правільна?



**Аляксандр ЧУБРЫК:** На самай справе, калі паглядзець на доўгую дынаміку развіцця рэгіёнаў, становіцца заўважна, што цэнтры прыцягнення фарміруюцца натуральным чынам. Зразумела, яны, як правіла, фарміруюцца вакол буйных гарадоў. Ёсць выключэнні, напрыклад, Астравец, дзе невялікі раён, але тэмпы міграцыйнага прыросту ў ім супастаўныя з тэмпамі міграцыйнага прыросту ў Мінскім раёне.

Ёсць некалькі істотных момантаў, на якія трэба звярнуць увагу. Першы: адкуль рэгіёнам браць рэсурсы? Напрыклад, Аршанскі раён не трапляе ў групу раёнаў, якія натуральным чынам сталі лакаматывамі росту. Ён, хутчэй, страчваў людзей, перайшоў з групы рэгіёнаў са шчыльнасцю насельніцтва ад 100 да 150 у катэгорыю ад 50 да 100 чалавек на квадратны кіламетр. Тое самае па Маладзечанскім раёне. Гэта калісьці былі раёны з буйнымі гарадамі, але яны страчваюць жыхароў. Чаму? Што прымушае людзей з'язджаць адтуль? І гэта на самай справе нават для буйных раёнаў вялікае пытанне. Для дробных — яшчэ большае.

Паставім пытанне інакш: што павінна ўтрымаць чалавека на канкрэтнай тэрыторыі, у рэгіёне, горадзе, пасёлку, вёсцы? Пытанне складанае. Першае: адукацыя. То-бок я хачу, каб мае дзеці атрымлівалі добрую адукацыю, каб у іх была будучыня. Другое: ахова здароўя. Зразумела, што старэнне — гэта агульная праблема для краіны, а не толькі невялікіх раёнаў, якія страчваюць людзей. Атрымліваецца, у нас ёсць раёны, дзе сярэдні ўзрост жыхароў набліжаецца да 50 гадоў. Напрыклад, Свіслацкі ці Зэльвенскі раёны Гродзеншчыны. Хоць па краіне ў сярэднім гэта каля 41 года. Гэта значыць, для сістэмы аховы здароўя на аддаленых тэрыторыях гэтыя праблемы дастаткова сур'ёзныя. І самае цікавае, праз 10, 15, 20 гадоў гэтыя ж праблемы будуць на тэрыторыях, якія зараз выглядаюць адносна добра. Таму што яны цяпер прыцягваюць рабочую сілу, а потым яна дасягне пенсійнага ўзросту і сфарміруе запыт на ахову здароўя.

Адпаведна, другі момант: што прымушае мяне тут жыць? Адукацыя, ахова здароўя і, самае галоўнае, — работа. Разумееце, пытанне заключаецца ў тым, што немагчыма забяспечыць работай усіх, хто тут жыве. Людзі гатовы ездзіць кудысьці, і для іх трэба стварыць нармальную лагістыку і транспартнае забеспячэнне. Да гэтага часу, калі мы возьмем Маладзечна, Барысаў, Стоўбцы Мінскай вобласці, — чаму дабрацца электрычкай ад іх да сталіцы займае шмат часу? Гэтыя рэчы, канешне, трэба адпрацоўваць. Зразумела, значную частку возьме на сябе прыватнік, але дзяржава можа зрабіць вялікі ўнёсак. І гэта не тыя задачы, якія дзяржава прызвычаілася вырашаць: не пабудова буйных, маштабных і развіццё інвестыцыйных праектаў, а лакальныя рэчы.

Яшчэ адно пытанне: як забяспечыць нармальную адукацыю ў рэгіёнах? Гэта ключавое пытанне, якое вынікае з зарплаты настаўнікаў. Чаму настаўнік павінен заставацца працаваць у рэгіёне? Чаму ён не павінен сысці з прафесіі, пераехаць у Мінск, дзе больш магчымасцяў зарабіць? То-бок пытанне затрымання чалавека на месцы — не толькі даць яму арэнднае жыллё, але і забяспечыць узровень жыцця і зарплаты. Для чалавека, які не бюджэтнік і гатовы ездзіць, трэба забяспечыць нармальную лагістыку, камунікацыю і доступ да сістэмы аховы здароўя.

Нарэшце, найважнейшае пытанне ўнутранага рынку. Мы кажам, малы, сярэдні бізнес, прадпрымальніцтва павінны стаць апорай там, дзе няма буйных маштабных праектаў. Але адкуль ім там узяцца? Калі ёсць Шаркаўшчынскі раён, які па заробку заўсёды быў горшы за ўсіх, адкуль там возьмецца прадпрымальнік, які не працуе ў сферы рытуальных паслуг, устаноўцы шклопакетаў ці цырульні? То-бок пытанне: калі людзі з гэтага раёна могуць працаваць у іншых цэнтрах прыцягнення, яны забяспечаць унутраны рынак, і тады пачне працаваць гэты канал — драйвер развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Таму задача дзяржавы ў значнай ступені перыярыентуецца.

## Рэгіянальныя ўніверсітэцкія цэнтры



**Мікалай ШАЎЧУК:** Чаму 11 гарадоў і што там сёння не спрацавала? Указ своечасовы, на месцах з'явіўся энтузіязм, разуменне, што гарады атрымаюць новы імпульс, у прадпрыемствы будуць укладзены інвестыцыі. Яны абаранілі бізнес-планы, гарады — праграмы, усё разумеюць, што трэба рабіць. Але па выніках першага года 90 % сродкаў — гэта сродкі саміх прадпрыемстваў і арганізацый, 10 % — сродкі інавацыйнага фонду, танных крэдытаў, грошы, якія прыцягнуты іншым спосабам, і яны далі 1—3 % росту эканомікі ў гэтых гарадах. На мой погляд, ёсць абмежаваныя рэсурсы, але мы павінны атрымаць пункты росту, прарыў на гэтых 11 гарадах для таго, каб яны потым сталі донарамі развіцця для навакольнай тэрыторыі.

У кожным рэгіёне ёсць суперсучасныя прадпрыемствы, і, па вялікім рахунку, гэты абмежаваны рэсурс — танныя крэдыты, асабліва сродкі дзяржаўнага інавацыйнага фонду — трэба інвеставаць у такія прадпрыемствы. У якасці прыкладу прывяду Полацкі раён і суперсучасны завод металаканструкцый, дзе працуе 400 чалавек, 99,8 % прадукцыі экспартуецца. Ён зноў мадэрнізуецца, туды ўкладзены інвестыцыі (у тым ліку дзяржаўныя), там з'явяцца новыя рабочыя месцы з высокай заработнай платай, і гэтае прадпрыемства дасць рэгіёну эканамічны рост.

Яшчэ адзін прыклад сучаснага прадпрыемства — «Шкловалакно», дзе працуе 4 тысячы чалавек. Сёння дзяржава туды ўкладвае сур'ёзныя грошы — гэта другі драйвер росту. Але ёсць шэраг прадпрыемстваў — рабі, не рабі ўкладанні — рынку збыту няма! Таму выбіраем лепшыя прадпрыемствы, робім укладанні, і яны самі стануць пунктамі росту для горада, раёна.

> Самае важнае — стварыць умовы, каб чалавек меў магчымасць зарабіць: прыйдуць сродкі ў бюджэт — тады лягчэй працаваць і мясцоваму самакіраванню. Калі раён датацыйны, не зарабляе на сваё ўтрыманне, якое б самакіраванне мы там ні стварылі, што атрымаецца?

**Юрый ПРАКОПАЎ:** А што з людзьмі, якія працуюць на іншых прадпрыемствах?

**Мікалай ШАЎЧУК:** Мы ні ў якім выпадку не кідаем тыя прадпрыемствы, яны таксама абаранілі бізнес-планы, мы з імі працуем, ім дапамагаюць горад, аблвыканкам, укладваюцца рэсурсы, але максімальныя грошы туды ўкладваць нельга. Трэба, каб былі пункты росту.

Што яшчэ? Трэба навучаць людзей на месцах. Калі Салігорск стане ўніверсітэцкім горадам, людзі адтуль нікуды не паедуць. Кожная сям'я салігарчан сёння звязана з шахтай, і калі чалавек атрымае вышэйшую адукацыю, ён застанецца. А калі ён паехаў вучыцца ў Мінск, у яго з'явілася кола зносін, сябры, ён знайшоў работу, і вяртацца ў рэгіён не хочацца. Нам трэба перагледзець работу ВНУ. Патрабуюцца рабочыя месцы для Салігорска? Неабходна адкрываць там філіял факультэта, які рыхтуе спецыялістаў для горназдабываючай прамысловасці.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Тэлесеткі

Што датычыцца адукацыі — догмаў не павінна быць, а павінна быць ініцыятыва. Я прывяду прыклад ПВТ: мы разумеем, што IT-спецыялісты сканцэнтраваны ў Мінску. Аказваецца, сітуацыя трохі іншая — яны гатовы працаваць усюды, дзе ім будуць створаны спрыяльныя ўмовы. У Магілёве пабудавалі «Атрыум» — буйны цэнтр на 43 тысячы «квадратаў», — і пяць паверхаў занялі IT-спецыялісты. Нават з Расіі і з-за мяжы прыехалі і кажуць, што нікуды адсюль не з'едуць. І колькасць спецыялістаў расце: спачатку было 50, цяпер 270. Але ім стварылі ўмовы: заробкі, камфортныя ўмовы працы, магчымасць жыць, камунікацыю.

## А колькі драйвераў павінна быць?

**Алег МАКАРАЎ:** Хачу развіць думку, звязаную з мабільнасцю. Мне траплялася інфармацыя, што беларусы адрозніваюцца ад суседзяў максімальна нізкай мабільнасцю, то-бок калі жыхары іншых краін арыентаваны на хуткую змену рэгіёна жыхарства ў залежнасці ад таго, дзе з'яўляецца выгадная вакансія, то для Беларусі — гэта пытанне. І гаворка ішла пра тое, што асноўная матывацыя звязана з жыллём: там, дзе з'яўляецца магчымасць яго атрымаць, з гэтым звязана мабільнасць. У выніку праблема заключаецца ў выбары шляху, па якім ісці: будаваць хуткасную чыгунку ці філіял ВНУ? Калі мы глядзім на еўрапейскія трэнды, бачым дакладны трэнд на павышэнне мабільнасці і перамяшчэнне працоўных рэсурсаў з аднаго цэнтра-драйвера да другога ў залежнасці ад іх развіцця. А калі мы глядзім на беларускі запыт, бачым, што насельніцтва хацела б, каб у рэгіёне пражывання былі рабочыя месцы, каб яны прыйшлі да іх, а не наадварот. І гэта праблема: ці можам мы гэта змяніць? Другое пытанне: ці не атрымаецца так, што, вызначыўшы 11 гарадоў, мы пачнём працаваць з імі дырэктыўна, а яны самі не гатовы стаць драйверамі? На самай справе тэрыторыі — гэта не «нарэзаныя» кавалкі, куды было накіравана насельніцтва. Па сутнасці, усе тэрыторыі маюць гістарычныя карані, свой настрой. Ці, можа, адкрыць спіс і сказаць: калі іншыя гарады гатовы цягнуцца за драйверамі, калі ласка, далучайцеся?

З другога боку, мы ведаем, што ў падрыхтоўцы праграм развіцця актыўны ўдзел бралі самі гарады, фарміравалі свае пункты росту. Але ці дастаткова гэтага? Можа, трэба вярнуцца да настрою горада, каб была энергетыка людзей, звязаная з тым, якім яны хочуць бачыць свой рэгіён, горад, і больш задзейнічаць магчымасці бізнесу і грамадства для таго, каб не толькі метадам націску выконваць паказчыкі?

**Аляксандр ЧУБРЫК:** Вы непасрэдна падышлі да такой важнай тэмы, як мясцовае самакіраванне. Цяпер фактычна ёсць вертыкаль выканаўчай улады, а тыя органы прадстаўнічай улады, якія існуюць, у значнай ступені чакаюць даручэнняў ад выканаўчай галіны. Сваю функцыю камунікацыі з выбаршчыкамі на месцах выконваюць, але функцыю прыняцця рашэнняў ад тых, хто іх абраў у мясцовыя Саветы, выконваюць усё менш. Як мы можам зразумець дух горада, тэрыторыі, калі людзі не маюць уплыву на прыняцце рашэнняў? А што гэта? Магчымасць размеркавання фінансавых сродкаў. І тут мы падыходзім да пытання бюджэтнай дэцэнтралізацыі. Ёсць выдатны прыклад Польшчы, Украіны ў адносінах да рэформы мясцовага самакіравання, калі фактычна людзям прапануюць: вось частка мясцовага бюджэту, якую вы можаце размяркоўваць па вашым разуменні. Уключаецца мясцовае самакіраванне, і людзі пачынаюць бачыць, як яны могуць паўплываць на тое, куды выдаткоўваюцца бюджэтныя сродкі на канкрэтнай тэрыторыі. Ёсць сэнс тут жыць! Калі мы хочам, каб людзі замацоўваліся і развіваўся дух, трэба разглядаць пытанне фіскальнай дэцэнтралізацыі мясцовага самакіравання.

> Буйныя драйверы павінны быць, але разам з імі неабходна разглядаць і донарства на сумежныя тэрыторыі.

Што датычыцца мабільнасці і жылля, для нас гэта складана. Па апытаннях для большасці жыллё — галоўнае. Такое адчуванне, што дзяржава існуе для забеспячэння жыллём сваіх грамадзян. Мне бліжэйшая пазіцыя, калі чалавек павінен мець магчымасць зарабіць сабе на жыллё. І большая частка працоўнай міграцыі ў Беларусі існуе для таго, каб чалавек паехаў, зарабіў грошы і купіў, адрамантаваў, пабудаваў жыллё. Праз гэта праходзіць большая частка беларускіх сем'яў. Вось мабільнасць, і яна звязана з жыллём. Гэтыя падыходы, якія ў нас існавалі дзесяцігоддзямі і далі эфект нараджальнасці ў гарадах, зжылі сябе ў значнай ступені. Так, жыллёвая падтрымка патрэбна, але ў якіх маштабах? Дзяржава падтрымлівае сем'і ці забудоўшчыка? Пакуль выглядае, што апошніх за кошт падаткаплацельшчыкаў, і не толькі іх, але і тых сем'яў, якія не трапляюць пад ільготныя катэгорыі, а ў выніку перагрэву рынку жылля вымушаны плаціць вышэйшую цану.

На самай справе істотнымі з'яўляюцца пераход да мабільнасці і змена падыходаў да арэнднага жылля. Цяпер ты можаш мець арэнднае жыллё, пакуль працуеш, а не — жылля няма. Магчымасць здымаць арэндную кватэру ты павінен мець, калі хочаш жыць тут у незалежнасці ад тваёй ведамаснай падпарадкаванасці. Я лічу, гэта зменіць падыходы і людзей. Таму што ўтрыманства з пункту гледжання жыллёвай палітыкі ў нас існуе і абмяжоўвае нашу мабільнасць. Праблема ў чым: што калі ты едзеш па жыллё, ты, з'ехаўшы, не вяртаешся. Калі едзеш па работу — вяртаешся. Таму тут важная задача для перафарматавання жыллёвай палітыкі.

## Зарабі, а потым размяркоўвай

**Алег МАКАРАЎ:** Я хацеў спытаць экспертаў: што ў вашым разуменні ідэальны горад сярод 11 абраных? Ці ёсць прыклад, які трэба браць за аснову, а калі няма, давайце яго змадэлюем.

**Міхаіл РУСЫ:** Ідэальнага няма нічога. Будзе ён добры — нам трэба будзе яшчэ нешта развіваць.

А наогул горад павінен быць бездатацыйны, які забяспечвае павышаныя стандарты пражывання людзей. Калі ёсць рабочыя месцы, зарплата, куды пайсці, дзе патраціць грошы, ёсць будучыня — вось такія рэгіёны вымалёўваюцца. А другі кірунак, як развіваць, ужо павінны бачыць органы ўлады, каб развіццё было не аднаго цэнтра, але і сумежных тэрыторый.

Што датычыцца мясцовага кіравання і самакіравання — гэта адно з цікавых пытанняў, і яно будзе атрымліваць пастаяннае развіццё. Я мяркую, чарговы крок па стварэнні ўмоў для рэалізацыі сваіх магчымасцяў будзе зроблены ў самы кароткі час. Аналізуючы выступленні ўсіх — дэпутатаў, аналітыкаў, палітыкаў, апазіцыі — можна ўбачыць, што ўсе дзеляць: я пабудаваў бы тое, я зрабіў бы тое, а самае галоўнае — трэба спачатку зарабіць. Вось калі мы заробім і гэта будзе ў бюджэце, тады дзяліць будзе лягчэй.

Самае важнае — стварыць умовы, каб чалавек меў магчымасць зарабіць: прыйдуць сродкі ў бюджэт — тады лягчэй працаваць і мясцоваму самакіраванню. Калі раён датацыйны, не зарабляе на сваё ўтрыманне, якое самакіраванне мы там ні стварылі б, што атрымаецца? Настаўніку трэба заплаціць, сцяжынку пракласці, садок за кошт іншых тэрыторый пабудуем, а самакіраванне павінны развіваць па прынцыпе: зарабілі самі і размеркавалі. Цяпер прынята рашэнне: нават калі бюджэт датацыйны, усё, што зароблена звыш яго, мясцовыя органы ўлады размяркоўваюць самастойна. Зарабі сельсавет — няхай ён вызначыць, калодзеж, водаправод пабудуе ці што іншае. Там, дзе трэба стварыць умовы для пражывання людзей, будзе зроблены сур'ёзны крок, і праблематыка ў мясцовым самакіраванні ёсць. Ёсць адпаведныя даручэнні, мы працуем цяпер з рознымі варыянтамі. Я лічу, разам з вамі будзем прыходзіць да гэтага кірунку. У краіне ў нас 18 100 дэпутатаў, таму арсенал у выражэнні меркаванняў і інтарэсаў людзей задзейнічаны вялікі. Гэта ў нейкім сэнсе і рэзерв нашых кадраў, і рэзерв развіцця тэрыторый.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**
**Фота БелТА.**

# «Грамадскую ініцыятыву важна пачуць і падтрымаць»

### Старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар Жук правёў прамую тэлефонную лінію з жыхарамі рэгіёна

**За тры гадзіны паступіла каля двух дзясяткаў зваротаў, большасць з якіх датычылася жыллёвых праблем, сферы паслуг, сацыяльнай інфраструктуры індывідуальнай жылой забудовы.**



Фота grodnonews.

Згодна з існуючай практыкай, разам са старшынёй аблсавета на званкі адказвалі і прадстаўнікі шэрагу службаў абласной выканаўчай улады. Гэта дазволіла не толькі выслухаць максімальную колькасць зваротаў, але і аператыўна адрэагаваць на іх, растлумачыць грамадзянам алгарытм дзеянняў па той ці іншай праблеме. На думку Ігара Жука, колькасць зваротаў зніжаецца. Гэта абумоўлена тым, што многія набалелыя пытанні ўдалося вырашыць. Да таго ж расце ўзровень інфармаванасці грамадзян. Каб атрымаць адказ, жыхары звяртаюцца ў адпаведныя службы па месцы жыхарства. Многія пытанні здымаюцца пасля сустрэч дэпутатаў са сваімі выбаршчыкамі.

> Аналіз такога ўзаемадзеяння паказаў, што дэпутацкаму корпусу трэба ўдасканальваць работу, шукаць новыя яе формы і метады, каб узняць мясцовае самакіраванне на вышэйшы ўзровень.

— Многае робіцца як мясцовымі ўладамі, так і дэпутацкім корпусам вобласці, — адзначыў Ігар Жук. — Напрыклад, летась дэпутаты мясцовых Саветаў амаль у два разы павялічылі колькасць сустрэч з працоўнымі калектывамі і з жыхарамі сваіх выбарчых участкаў. Падчас такіх сустрэч жыхары даведваюцца пра тое, чым будзе жыць і як развівацца той ці іншы населены пункт, што будзе зроблена ў бліжэйшы час, а што — у перспектыве. Такая інфармаванасць дапамагае здымаць многія пытанні. У выніку зменшылася колькасць зваротаў і да саміх дэпутатаў, і ў цэлым у Саветы.

І ўсё ж зваротная сувязь неабходна, лічыць старшыня Гродзенскага аблсавета. І сустрэчы, і прамыя лініі дазваляюць праманіторыць сітуацыю як у асобным працоўным калектыве, так і ў цэлым па населеным пункце і нават па раёне.

Аналіз такога ўзаемадзеяння паказаў, што дэпутацкаму корпусу трэба ўдасканальваць работу, шукаць новыя яе формы і метады, каб узняць мясцовае самакіраванне на вышэйшы ўзровень. У першую чаргу варта прыцягнуць да сумеснай работы неабыякавых людзей.

— Адной з задач дэпутатаў якраз і з'яўляецца ўменне разглядзець канструктыўныя прапановы грамадзян, якія клапоцяцца аб развіцці свайго населенага пункта. Добрая грамадская ініцыятыва павінна быць не толькі пачутая, але і рэалізаваная. У гэтым сэнсе жыхары і дэпутаты робяць адну важную справу. Напрыклад, за парадак на той жа вясковай вуліцы ці гарадскім двары павінны адказваць не толькі мясцовыя выканкамы і іх службы, але і самі жыхары. Вось да чаго нам трэба імкнуцца, — упэўнены Ігар Жук.

Амаль кожная прамая лінія з прадстаўнікамі ўлады не абыходзіцца без слоў падзякі ад жыхароў. Чарговы тэлефонны дыялог — не выключэнне. Гэтым разам жыхар з Воранава падзякаваў старшыні абласнога Савета дэпутатаў за аператыўнае вырашэнне праблемы з энергазабеспячэннем.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# ДАПАМОГА БУДЗЕ

## Ніводзін зварот жыхароў Міншчыны на прамую лінію не застанецца без увагі

**Самыя розныя пытанні хвалявалі жыхароў цэнтральнага рэгіёна, якія звярнуліся на прамую тэлефонную лінію, што правяла старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Якубіцкая. Гэта ўладкаванне дарог, атрыманне сямейнага капіталу, павышэнне пенсій, паляпшэнне медыцынскага абслугоўвання і шмат іншага. Адных заяўнікаў Наталля Віктараўна пракансультавала, запыты іншых накіравала ў адпаведныя службы і органы мясцовай улады. У азначаныя заканадаўствам тэрміны яны атрымаюць адказы. А ў некаторых выпадках спецыялісты выедуць на месца, каб разабрацца ў абставінах.**

Любоў Сцяпанаўна са Слуцкага раёна хадайнічала за сям'ю свайго сына, дзе выхоўваюцца чацвёра непаўналетніх дзяцей. Апошні хлопчык нарадзіўся нядаўна — яму сем месяцаў. Калі бацькі звярнуліся па сямейны капітал, высветлілася, што яны не маюць на яго права. Дакументы неабходна было падаць у адпаведныя службы, пакуль немаўляці не споўнілася шэсць месяцаў. Куды толькі не звярталіся сужэнцы — адказ адзін: прапушчаны ўстаноўленыя заканадаўствам тэрміны. Бацькам парэкамендавалі звярнуцца ў суд. Калі ён палічыць, што пратэрміноўка адбылася па аб'ектыўных прычынах, то пытанне можа вырашыцца станоўча.

Наталля Якубіцкая паабяцала разабрацца ў сітуацыі.

Віктар Анатолевіч з вёскі Бабоўня Капыльскага раёна паскардзіўся, што жыхары населенага пункта засталіся без урача, якая на два месяцы з'ехала на курсы павышэння кваліфікацыі, пасля сышла ў водпуск. А дабірацца да раённай паліклінікі старым людзям, інвалідам далекавата — дваццаць кіламетраў.

Наталля Віктараўна патэлефанавала старшыні Капыльскага раённага Савета дэпутатаў Ірыне Кісляк.

— Дайце даручэнне галоўнаму ўрачу цэнтральнай раённай бальніцы, каб накіроўваў на ўчастак медыка хоць раз на тыдзень, а пра час яго прыезду папярэджвалі жыхароў.

У няпростай сітуацыі аказалася Марына Фёдараўна з вёскі Андросаўшчына, зноў жа Капыльскага раёна. Яна ў разводзе з мужам, але жыве з ім пад адным дахам. Мужчына не плаціць аліменты, выносіць з кватэры і прадае яе рэчы. Жанчына звярталася ў міліцыю. Дэбашыра забіралі, а праз некалькі гадзін адпускалі, і ўсё паўтаралася нанова.

> Калі бацькі звярнуліся па сямейны капітал, высветлілася, што яны не маюць на яго права. Дакументы неабходна было падаць у адпаведныя службы, пакуль немаўляці не споўнілася шэсць месяцаў.

Наталля Якубіцкая даручыла Ірыне Кісляк узяць пытанне на асабісты кантроль, а таксама сабраць пасяджэнне Савета грамадскага пункта аховы парадку з запрашэннем на яго ўчастковага міліцыянера.

— Нельга дапускаць, каб дзеці былі сведкамі сямейных сцэн, якія траўмуюць іх псіхіку, — рэзюмавала яна.

Складаныя жыццёвыя абставіны прымусілі жыхара вёскі Яневічы Мядзельскага раёна Уладзіміра Віктаравіча папрасіць дапамогі. Ён, як і яго грамадзянская жонка, атрымлівае зусім невялікую пенсію. Грошай, вядома, не хапае.

— У вас ёсць дзеці? — пацікавілася Наталля Якубіцкая.

— У жонкі ёсць сын, які даводзіцца мне пасынкам. Яму пяцьдзясят гадоў, лайдачыць, нідзе не працуе. І чакаць ад яго дапамогі не выпадае.

— А ці наведвае вас сацыяльны работнік? — спытала Наталля Віктараўна і атрымала адмоўны адказ.

Наталля Якубіцкая звязалася са старшынёй Мядзельскага раённага Савета дэпутатаў Алегам Бароўкам:

— Вы, калі ласка, разбярыцеся ў сітуацыі. Неабходна, каб сацыяльныя службы наведаліся на месца. Магчыма, сям'і неабходна матэрыяльная дапамога. А можа, варта замацаваць за ёй сацыяльнага работніка.

Усяго ж Наталля Якубіцкая выслухала 27 заяўнікаў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

# ПРАСЦЕЙ РАЗБІРАЦЦА НА МЕСЦЫ

**На нядаўнім пасяджэнні Віцебскага аблвыканкама абмяркоўвалі тэму зваротаў грамадзян у мінулым годзе. На адрас адказных асоб, а некаторых з іх, напэўна, можна назваць безадказнымі, прагучала нямала крытыкі. Насамрэч асобныя факты непавагі да людскіх праблем проста шакіруюць. Чаму мясцовая ўлада не можа вырашыць нават самыя дробныя пытанні?**

У прыватнасці, першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення пісьмовых і электронных зваротаў галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Адміністрацыі Прэзідэнта Хрысціна Побаль паведаміла пра сігнал аб неабходнасці рамонту дзіцячай горкі. Жыхары Білева, спальнага мікрараёна Віцебска, аж тры гады (!) чакалі рамонту месца для гульняў дзяцей у двары. Звярталіся ў розныя інстанцыі і спадзяваліся на паразуменне. Сярод іншых не дапамог і дэпутат гарадскога Савета, які тры тыдні быў вельмі заняты сваімі рабочымі і асабістымі справамі, а не дэпутацкімі абавязкамі. І толькі пасля звароту ў Адміністрацыю Прэзідэнта сітуацыя змянілася. А гэта ж пытанне ў кампетэнцыі мясцовай улады! І зразумела, каб вырашыць праблему, не трэба было патрацiць шмат грошай. А хто-небудзь задумаўся з тых, да каго звярталіся, што праблемны «дзіцячы гарадок» мог стаць прычынай траўміравання, крый Божа, гібелі дзіцяці?

Хрысціна Побаль таксама расказала пра жыхара Аршанскага раёна, які на асабістым прыёме прасіў адрамантаваць воданапорную вежу, каб выключыць затапленне зямельных участкаў. У Адміністрацыю з мясцовай улады адрапартавалі ў лісце за подпісам намесніка старшыні райвыканкама, што ўсё неабходнае зроблена. Але пасля праверкі (заяўніку патэлефанавалі з Мінска) высветлілася, што зроблена гэта было толькі на паперы, якая, як вядома, усё сцерпіць.

А ў Гарадоцкім раёне толькі пасля звароту ў Адміністрацыю змаглі дабіцца аднаўлення дзейнасці крамы ў так званай крокавай дасягальнасці. Мясцовыя жыхары ну ніяк не хацелі хадзіць па пакупкі прыблізна за кіламетр...

Пры гэтым, як падкрэсліла прадстаўніца Адміністрацыі Прэзідэнта, ёсць у паўночнай вобласці краіны нагода для гонару мясцовай улады. Рост колькасці зваротаў у Адміністрацыю з Віцебшчыны летась склаў усяго 1 % — найлепшы паказчык у краіне (2330 зваротаў).

А з Адміністрацыі ў аблвыканкам накіравана для рэагавання 562 звароты — на 3,8 % больш, чым у 2018-м. І што цікава, патрабаванні па 26 зваротах (5 %) задаволілі.

Начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Віцебскага аблвыканкама Ілона Шульга канстатавала, што летась у мясцовыя органы ўлады было каля 37,6 тысячы зваротаў, што меней на 3 %, чым пазалетась.

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў параіў старшыням райвыканкамаў і іх падначаленым не пазбягаць «нязручных» тэм, пра якія сігналізуюць людзі. У ідэале трэба выехаць на месца, самім усё паглядзець, даручыць зрабіць хоць бы штосьці мінімальнае, каб чалавек адчуў клопат. Інакш грамадзяне працягваюць скардзіцца, але ўжо вышэй. І тады тыя лісты адпраўляюцца мясцовай уладзе на рэагаванне, каб (калі людзі маюць рацыю) было нешта зроблена. Губернатар параіў чыноўнікам у рэгіёнах старацца на мясцовым узроўні здымаць праблемныя пытанні.

Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Анатоль Ліневіч адзначыў, што сам ужо не раз упэўніўся падчас прыёмаў грамадзян у раёнах, што некаторыя праблемныя пытанні можна зняць за некалькі хвілін. Трэба толькі зразумець сутнасць, разабрацца з тым, што можна зрабіць, доўга не зацягваючы час. І лепш вырашаць праблему з выездам на месца. У крайнім выпадку заўсёды можна знайсці нейкі часовы варыянт для наступнага вырашэння пытання, якое хвалюе грамадзян.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Извещение о проведении 12 марта 2020 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | Капитальное строение с инв. номером 630/С-65814 (наименование – бухгалтерия-склад), общей площадью 94,9 кв. м; капитальное строение с инв. номером 630/С-65813 (наименование – кондитерский цех), общей площадью 122,8 кв. м; капитальное строение с инв. номером 630/С-65811 (наименование – склад), общей площадью 157,6 кв. м; капитальное строение с инв. номером 630/С-65816 (наименование – административное здание), общей площадью 42,0 кв. м; капитальное строение с инв. номером 630/С-79669 (наименование – водопроводные сети), протяженностью 4,1 кв. м |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Вокзальная, 4 |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь – 0,1382 га, кадастровый номер 623850100003001899, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений (административного здания, здания кондитерского цеха и здания складов) |
| **Продавец имущества** | ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск |
| **Организатор торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов, с учетом НДС** | 65 318,94 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 6500,00 бел. руб. |
| **Условия торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной Дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **12 марта 2020 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 10.02.2020 по 10.03.2020** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (017) 240-62-06.

**Телефоны для справок:** (017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 240-62-06 (ОАО «ДОРОРС»).

### Отчет об использовании своего имущества Благотворительного местного фонда «Открытые сердца» за 2019 год

Количество учредителей благотворительного местного фонда «Открытые сердца» – 1 человек, из них 1 – физические лица.

Единица измерения: тыс. бел. руб.

Информация о стоимости имущества благотворительного местного фонда «Открытые сердца» (далее – Фонд):

- остаточная стоимость основных средств на 31.12.2019 г. составляет 0,2 тыс. бел. руб., в том числе:

видеокамера «Панасоник» – 0,2 тыс. бел. руб.

- поступлений из иных источников, не запрещенных законодательством, – 54,3 тыс. руб., в том числе дотации из ФСЗН – 0,2 тыс. бел. руб.;

Общая сумма расходов, понесенных Фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в Уставе Фонда, составляет 56,6 тыс. бел. руб. В том числе:

- на выплату заработной платы, пособия по уходу за ребенком и хозяйственных расходов – 40,6 тыс. бел. руб.;

- на оплату налогов и обязательных платежей из ФЗП – 2,5 тыс. бел. руб.;

- на оплату поставщикам (буклеты, листовки, аренда и прочее) – 13,0 тыс. бел. руб.;

- прочие платежи (вознаграждения банку и др.) – 0,2 тыс. бел. руб.

Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах, созданных для осуществления предпринимательской деятельности.

УНП 790627109

# МАЛЕНЬКАЯ ЗЯМЛЯ ВЯЛІКІХ МАГЧЫМАСЦЯЎ

**У датацыйным раёне, дзе каля паловы насельніцтва задзейнічана ў эканоміцы, а чвэрць жыхароў — дзеці і падлеткі, змаглі за апошнія чатыры гады распрацаваць і ажыццявіць 12 мясцовых ініцыятыў. Як сацыяльны эфект абярнуць на карысць эканоміцы? Вопыт калег з Кармяншчыны вывучалі дэпутаты Гомельскай вобласці. У фармаце жывога дыялогу прайшоў традыцыйны выязны семінар старшынь Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню.**

Гасцей на чале з кіраўніком Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярынай Зенкевіч сустрэлі старшыня Кармянскага райвыканкама Андрэй Турук і старшыня раённага Савета дэпутатаў Таццяна Шэхцер. Спачатку быў зроблены невялікі экскурс у гісторыю і сучаснасць Кармяншчыны, коратка расказана пра асаблівасці тэрыторыі, насельніцтва, сацыяльнае і эканамічнае становішча. Праграму семінара гаспадары падрыхтавалі насычаную, таму не праз даклады, а на справе прапанавалі ацаніць вынікі работы органаў мясцовага кіравання і самакіравання.

— Пляцоўка для генерацыі і апрабацыі найлепшых ідэй па папулярызацыі здаровага спосабу жыцця, — прэзентавала першы аб'ект **начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Наталля ЕЎТУХОВА.** — Фізкультурна-аздараўленчы комплекс ДЮСШ Кармянскага раёна паўтара года таму быў перададзены з балансу Райжылкамгаса аддзелу адукацыі, спорту і турызму райвыканкама. Вырашылі працягваць на яго базе больш актыўную работу па праграме «Карма — здаровы гарадскі пасёлак».

> Каб пасля заканчэння праекта засталіся вынікі — толькі з такой мэтай можна брацца за любыя праекты, лічаць куратары яшчэ адной ініцыятывы, якая дакладна падарыла дзясяткам вясковых жыхароў магчымасць атрымаць спецыяльнасць, працаўладкавацца ці адкрыць сваю справу.

Да работы падключыліся ўсе суб'екты прафілактыкі. Фінансавую дапамогу атрымалі па праекце садзеяння развіццю на мясцовым узроўні ў Беларусі праз праграму ААН. У яе межах для дзяцей набылі 30 веласіпедаў, яшчэ сем падаравалі спонсары. Цяпер у комплексе для дзятвы бясплатна праходзяць заняткі па плаванні ў басейне. Бясплатныя групы і для пенсіянераў. Апошнія, дарэчы, — заўзятыя аматары пакруціць педалі на спартыўных трэнажорах комплекса.

Пра тое, наколькі такая ініцыятыва ўлад атрымала шырокую папулярнасць, сведчаць фотасправаздачы і водгукі ў сацсетках, якія аматары здаровага спосабу жыцця пакідаюць пад хэштэгам: «Карма за здаровы спосаб жыцця». Да штогадовага красавіцкага велафестывалю ў Карме ўжо далучаюцца жыхары з іншых раёнаў, а таксама госці з Італіі, Бельгіі і Аўстрыі.



Кармянская ініцыятыва па новай форме сацыяльнай падтрымкі пажылых людзей таксама можа стаць добрым прыкладам для ўкаранення ў іншых раёнах Гомельшчыны, выказала ўпэўненасць старшыня абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Зенкевіч падчас наведвання Кармянскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

У раёне цяпер на ўліку сацслужбаў знаходзіцца больш за дзве тысячы грамадзян розных катэгорый. Працуюць і з тымі, хто звяртаецца самастойна, але і самі прапануюць дапамогу сталым, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі.

— Наша правіла: з кожным пажылым чалавекам павінен працаваць псіхолаг. Мы цесна супрацоўнічаем са старшынямі сельсаветаў, бо наша дапамога вельмі патрэбна самотным пенсіянерам, інвалідам у аддаленных вёсках, — расказала пра сацыяльны клопат на Кармяншчыне **начальнік аб'яднанага ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Чачэрскага раёна Вольга ЗАХАРАНКА.** — У гарадскім пасёлку Карма і ў сельскіх населеных пунктах ёсць дамы сумеснага, часовага пражывання, гасцявыя, прыёмныя, патранажныя сем'і. Валанцёры на бязвыплатнай аснове бяруць да сябе ў дом зусім чужога састарэлага чалавека і даглядаюць яго.

Кармянскі раён, дарэчы, адзін з нямногіх у Гомельскай вобласці, дзе прынялі рашэнне ўзяць у арэнду кватэру з гарадскога жылфонду для аказання неабходных сацыяльных паслуг насельніцтву.

— Гэтая двухпакаёвая кватэра знаходзіцца насупраць цэнтра сацыяльнага абслугоўвання. Цяпер там ідзе рамонт, а потым заселім туды некалькі пажылых людзей, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі ці якім не дазваляе здароўе зімаваць адным у аддаленай вёсцы, — расказвае спікер.

З мэтай зніжэння нагрузкі на бюджэт Кармянскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання актыўна працуе з праграмамі міжнароднай тэхнічнай і гуманітарнай дапамогі. На сродкі аднаго з праектаў, напрыклад, закупілі веласіпеды і неабходнае спецадзенне для сацыяльных работнікаў.

Каб пасля заканчэння праекта засталіся вынікі — толькі з такой мэтай можна брацца за любыя праекты, лічаць куратары яшчэ адной ініцыятывы, якая дакладна падарыла дзясяткам вясковых жыхароў магчымасць атрымаць спецыяльнасць, працаўладкавацца ці адкрыць сваю справу.

На базе Барсукоўскага сельскага Савета дэпутатаў рэалізаваны праект «Стварэнне ў Кармянскім раёне Гомельскай вобласці Цэнтра нефармальнай адукацыі».

— Гэта адукацыйная ініцыятыва ў межах праекта «Вучыцца, каб дзейнічаць» пры суправаджэнні гомельскай пярвічнай арганізацыі «Беларускай асацыяцыі маладых хрысціянскіх жанчын», — расказала **старшыня гэтага сельсавета Святлана КАРАТКЕВІЧ.** Праект фінансаваўся Еўрапейскім саюзам. Партнёрамі выступілі Кармянскі раённы Савет дэпутатаў, тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і Барсукоўскі сельскі Савет дэпутатаў.

Мэта праекта — адаптацыя людзей, якія трапілі ў складаную жыццёвую сітуацыю, да патрабаванняў рынку працы і садзейнічанне ім у пераадоленні крызісу. Жыхары не толькі сельсавета, але і ўсяго раёна ў мэтавых групах прайшлі тэорыю і практыку заняткаў мастацкай творчасцю, курсы па пэчворку. Людзі навучыліся тэхніцы шыцця са шматкоў тканіны, атрымалі навыкі работы на швейнай машынцы, навучыліся рамантаваць адзенне. Акрамя таго, у межах праекта ў Гомелі жанчыны прайшлі курсы майстроў па манікюры, педыкюры, па цырульным майстэрстве.

Гэта шанц адкрыць свой маленькі бізнес. Цяпер, калі яны маюць на руках дакумент пра наяўнасць спецыяльнасці, гэта зрабіць прасцей. Да таго ж у межах праекта кожны атрымаў парады ад юрыста па афармленні статусу самазанятага. Зараз у Кармянскім раёне ладзяць яшчэ адну адукацыйную праграму па развіцці фермерства і вядзенні прыватнай дапаможнай гаспадаркі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

ШТО ХВАЛЮЕ?

# КАБ НЕ ПАВЕСІЛІ ЗАМОК

## Жыхары Бабіч не хочуць страціць адзіную ў вёсцы грамадскую ўстанову

**Некалі ў Бабічах, што на Брэстчыне, была школа, быў магазін. Цяпер няма нічога, толькі ў памяшканні ранейшай крамы размяшчаецца дом сацыяльных паслуг. Апошні ў Камянецкім раёне. Ён служыць людзям медпунктам, калі прыязджае ўрач, залай пасяджэнняў — калі праводзіцца сход альбо сустрэча з прадстаўнікамі розных службаў, домам культуры — калі выступаюць самадзейныя артысты. А ў астатнія дні гэта сапраўдны клуб па інтарэсах для жыхароў, якіх у вёсцы засталося тры дзясяткі.**



Валянціна ПРАЛІСКА.

### Мясцовая славутасць

У гэтым клубе мы сустрэлі яго кіраўніцу Лідзію Шамяцюк і жыхарку Бабіч Валянціну Праліска. Валянціна Аляксандраўна — мясцовая славутасць. Яна малюе, спявае, піша вершы-сказанні, пячэ караваі. Яна аптыміст, а яшчэ вялікі аматар прыроды. Вясковая жанчына — самавучка, малюе найчасцей алоўкам, нават шарыкавай ручкай. Некаторыя яе сюжэты нагадваюць анімацыйны рад. Бачыць пенсіянерка за акном буслоў, якія толькі вярнуліся з выраю на сваё гняздо, — і тут жа замалёўвае птушак: як яны стаяць, нават абдымаюцца доўгімі шыямі, як папраўляюць гняздо, як бусел потым носіць ежу сваёй сяброўцы, што выседжвае птушанят. Зламалася бярэзіна побач з домам — Валянціна Аляксандраўна яе тут жа замалёўвае ў альбоме, бо карцінка з гэтым самым дрэвам ва ўсёй красе ў яе ёсць.

> Гэту ўстанову добра ведаю, бываў не раз на іх мерапрыемствах, калі свята вёскі праводзілі, напрыклад. Сюды ж бібліятэчны аўтобус раз на месяц прыязджае, кнігі прывозіць. Але ж установа стратная, прынятае рашэнне яе зачыніць. Толькі як пагаварыў з людзьмі, паглядзеў у вочы гэтым руплівым жанчынам, паабяцаў ім яшчэ хоць на год клуб пакінуць.

— Усё жыццё, колькі сябе памятаю, малюю, — расказвае жанчына. — Калі была маладая, часу вечна не хапала. Працавала ў калгасе, дзяцей гадавала, свая гаспадарка вялікая, адзін час тры каровы з мужам трымалі. Але ўсё роўна... у тры гадзіны ночы, у выхадныя, у святы запісвала, замалёўвала. Бягу, бывала, у сваю родную Мікалаеўшчыну, па дарозе ўбачу акацыю, якая так прыгожа расцвіла. Стаю ледзь не паўгадзіны — любуюся, знаю, што потым намалюю, можа, яшчэ верш напішу.

А яшчэ Валянціна Праліска спявае. Згадвае, як некалі ў школьнай самадзейнасці бліскуча выступала на сцэне. А потым да бацькоў прыехалі са школы і музычнага вучылішча, раілі адпусціць дачку вучыцца ў Брэст. Але бацькі не маглі сабе гэтага дазволіць, бо старэйшы сын вучыўся ў інстытуце ў Львове, трэба было яму дапамагаць. «Так і скончылася мая музычная кар'ера», — з іроніяй згадвае пенсіянерка. Але ж яна не крыўдуе на бацькоў: сама не вельмі хацела з дому ад'язджаць у горад. Пасля сямігодкі дапамагала па гаспадарцы. Рана выйшла замуж. Сусед прыйшоў пасля службы ў марфлоце — як убачыла яго ў бесказырцы ды паласатай цельняшцы, ёкнула сэрца. Пражылі паўвека разам, дзяцей выгадавалі, дачакаліся не толькі ўнукаў, але і праўнукаў.

Цяпер вось адна. Таму часцей дастае сшытак з ранейшымі творамі, больш перачытвае, чым запісвае. Згадала, як аднойчы муж расказваў пра свайго бацьку, які не вярнуўся з вайны. Ён тады быў найменшы ў сям'і. Калі праводзілі бацьку, трымаў яго за руку — думаў, калі будзе трымаць вельмі моцна, той не захоча адпускаць і не сыдзе ад іх. А потым не верыў пахаванцы. Чакаў яго доўга. З таго аповеду яна напісала доўгі верш-сказанне. І прачытала яго мужу толькі адзін раз, бо дарослы мужчына вельмі расстроіўся, разнерваваўся, доўга не мог супакоіцца.

Але ж больш Валянціна Аляксандраўна піша не пра вайну, а пра прыроду, гэта заўсёды была любімая тэма. І піша, вядома, не толькі для сябе. Шмат яе малюнкаў упрыгожваюць Дом сацыяльных паслуг. Убаку за сталом стаіць калядная звязда. Яе ўпрыгожыла і аздобіла Валянціна Аляксандраўна. Самадзейныя артысты з іншых вёсак нярэдка пазычаюць.

### Культурны і духоўны ачаг

— А колькі караваяў напякла на вяселлі наша Аляксандраўна! — кажа Лідзія Шамяцюк. — Словам, таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім.

Лідзія Пятроўна, у мінулым настаўніца пачатковых класаў, — умелы арганізатар і пастаноўшчык усіх мерапрыемстваў. Старшыня сельскага Савета Віктар Міхайлоўскі расказаў, што ў цяперашнім клубе выступалі найлепшыя самадзейныя калектывы раёна:

— У Бабічы няпроста прыехаць, сюды яшчэ трэба трапіць. Паміж калектывамі нават бывае канкурэнцыя за выступленне менавіта ў Бабічах. Бо тут не проста сустракаюць гасцей, а рыхтуюць сапраўднае шоу з боку гаспадароў. Лідзія Пятроўна збярэ ўсіх людзей, хто толькі можа стаяць на нагах, прыходзяць і з суседніх вёсак. Для артыстаў ладзяць цэлую чайную цырымонію, сустракаюць іх пірагамі. Аднойчы з Жабінкі прыехаў калектыў з 28 чалавек. Калі ўбачылі гэты будынак былога магазіна, крыху сумеліся. Маўляў, што гэта за культурная ўстанова. А калі зайшлі, пагаварылі, паспявалі, то і ад'язджаць не спяшаліся.

Адзіную грамадскую ўстанову жанчыны ўладкавалі з любоўю. На падлозе пасланы вытканыя іх рукамі ходнікі. Сцены, сталы ўпрыгожваюць вышыванкі, карціны. Нават даўнішнія фартушкі сваіх маці і бабуль яны прымацавалі ў выглядзе невялікай экспазіцыі. Асобны куток прысвечаны рэлігійнай тэматыцы — сюды ж прыязджае айцец Міхаіл з Трасцяніцы, праводзіць гутаркі, сустракаецца з прыхаджанамі, зусім старых і нямоглых спавядае, перад святам Вялікадня асвячае кулічы. Так што ролю культурнага і духоўнага ачага гэты дом цалкам выконвае. На стале заўважаю вялізны альбом працоўнай славы з фотаздымкамі.



Лідзія ШАМЯЦЮК.

### Фотаздымкі, якія не згарэлі

Цікавая аказалася яго гісторыя. Гэтае фатаграфічнае сведчанне дзясяткаў гадоў калгаснай работы выхапілі ледзь не з агню. Калі тутэйшы калгас скасавалі, ці, правільней сказаць, далучылі да іншага, кантора збіралася выязджаць, дакументы альбо вывозілі, альбо палілі. Вось у топку атрымаў накіраванне і гэты альбом, яго ўжо прынеслі ў кацельную, каб спаліць. Але ж качагары пагарталі, можа, каго знаёмага на здымках убачылі — і не здолелі кінуць у агонь — сказалі Лідзіі Пятроўне, яна і забрала рарытэт. Цяпер той грунтоўны альбом у цвёрдым пераплёце ляжыць на пачэсным месцы. Многія дзеці, унукі былых калгасных перадавікоў заходзяць паглядзець. Некаторыя з дазволу гаспадынь забралі фотаздымкі родных — аказалася, у іх сямейных архівах не было такіх, дзе маладыя маці альбо бацька сфатаграфаваныя на сваіх рабочых месцах.

### Клуб ці дом — абы не зачынілі

Паводле дакументаў гэты дом называецца клубам, бо знаходзіцца на балансе аддзела культуры райвыканкама. І яго аматары хвалююцца, што ўстанову могуць закрыць. Тым больш што гаворка аб гэтым вялася.

**Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама Мікалай ГРОМІК** расказаў карэспандэнту газеты, што аднойчы ўжо прыязджаў на сход у Бабічы, каб абвясціць людзям, што клуб закрываецца:

— Гэту ўстанову добра ведаю, бываў не раз на іх мерапрыемствах, калі свята вёскі праводзілі, напрыклад. Сюды ж бібліятэчны аўтобус раз на месяц прыязджае, кнігі прывозіць. Але ж установа стратная, прынятае рашэнне яе зачыніць. Толькі як пагаварыў з людзьмі, паглядзеў у вочы гэтым руплівым жанчынам, паабяцаў ім яшчэ хоць на год клуб пакінуць.

На развітанне жыхаркі Бабіч прасілі мяне напісаць у газеце, каб іх установу пакінулі. Не такія ўжо вялікія грошы на яе ўтрыманне выдаткоўваюцца нават у маштабах раёна. У крайнім выпадку айцец Міхаіл гатовы ўзяць гэты дом пад крыло царквы, калі б перадалі яго бязвыплатна альбо за адну базавую велічыню. Бо лягчэй за ўсё павесіць замок і сказаць, што пытанне вырашана.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Камянецкі раён.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 6 лютага 2020 года.